М. І. Верціхоўская



# Залатыя зярняты

## Тлумачальна-перакладны слоўнік

## 2 клас




Мінск
«Пачатковая школа»
2009

www.kamunikat.org

УДК
811.161.3374.3
ББК 81.2Беи-4

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар *В. І. Іўчанкаў*
кандыдат філалагічных навук, прафесар *В. П. Красней*
доктар педагагічных навук, прафесар М. Г. *Яленскі*

Верціхоўская, М. І.
Залатыя зярняты : тлумачальна-перакладны слоўнік : 2-гі кл. / М. І. Верціхоўская. — Мінск : Пачатковая школа, 2009. — 176 с. : іл.

ISBN 978-985-6947-07-3.

Гэты дапаможнік стане сапраўдным сябрам для вучняў пры вывучэнні беларускай мовы, патлумачыць незразумелыя словы і нават праілюструе іх прыкладамі выкарыстання ў творах беларускіх аўтараў, што, безумоўна, дапаможа развіць у школьнікаў цікавасць да роднай мовы.
Слоўнік змяшчае больш за 1500 слоў і адрасуецца вучням, іх бацькам, настаўнікам пачатковых класаў, выхавацелям дзіцячых садоў і груп падоўжанага дня.

УДК
811.161.3374.3
ББК 81.2Беи-4

ISBN 978-985-6947-07-3
© Верціхоўская М. І., 2009
© Афармленне. Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва "Пачатковая школа"», 2009

www.kamunikat.org




**ЮНЫ ДРУЖА!**

Ты хочаш авалодаць вялікім скарбам сваіх дзядоў і прадзедаў — беларускай мовай? Гэты слоўнічак стане тваім памочнікам у такой важнай і ганаровай справе. І да ўсяго зробіць яе яшчэ і цікавай. Каб ведаць мову і свабодна карыстацца ёю, трэба найперш добра разумець сэнс слоў і правільна іх ужываць. У гэтым табе дапаможа **пераклад** на рускую мову. Ёсць у слоўніку і **тлумачэнні,** у якіх коратка і зразумела раскрываецца сэнс слоў.

Аднак галоўнымі тваімі памочнікамі стануць **тэкст** і **кантэкст.**

Кантэкст — гэта такая "кампанія" слоў, якая дазваляе вызначыць сэнс кожнага з іх. Кантэкст дапаможа табе дазнацца сэнсу слоў у гэтай "кампаніі", нават калі некаторых ты не ведаў. Вось якая чароўная сіла кантэксту! Толькі ў кантэксце слова набывае канкрэтнае значэнне і выконвае сваю ролю. Таму нават самае настойлівае завучванне слоў, вырваных з кантэксту, да пажаданых вынікаў не прывядзе. Мы ж падабралі такія ўрыўкі з дзіцячых кніжак, каб зразумела, цікава, нават з гумарам раскрываўся сэнс большасці слоў. Прычым у вершаванай форме: варта прачытаць адзін-два разы — і тут жа запомніцца некалькі радкоў. А значыць, цэлыя "кампаніі" слоў адразу стануць тваім маўленчым здабыткам.



www.kamunikat.org

Параўнай, калі ласка, два спосабы тлумачэння слова:

**Дранік** — аладка, блін з дранай бульбы.

Для мяне і для ката страва з бульбы — смаката!

Сёння мама раненька напякла нам дранікаў.

Які спосаб табе больш падабаецца?

Ты толькі не палянуйся прачытаць урыўкі-ілюстрацыі. Спадзяёмся, яны так табе спадабаюцца, што ты захочаш прачытаць іншыя творы гэтых пісьменнікаў. Вучоныя даводзяць, што найкарацейшы шлях да авалодання мовай — як мага больш чытаць добрых кніжак і па магчымасці больш вучыць на памяць.

Слоўнічак найперш скіраваны на развіццё твайго маўлення. Хочацца верыць, што такую яго адметнасць заўважаць настаўнікі і наладзяць адпаведную працу на ўроку.

Напрыклад, многія ўрыўкі могуць стаць штуршком да развіцця фантазіі, творчасці. Так, да слова "сорамна" мы падабралі радкі з казкі У. Дубоўкі "Адна гарошына":

Стала сорамна ўсім,
Як дазналіся аб тым,
Што ўвесь пачаўся бой
Ад гарошынкі малой.

Гэта ўжо канец казкі, яе развязка. А што магло ёй папярэднічаць? Паспрабуй прыдумаць пачатак і працяг казкі, а потым звер уласную фантазію з пісьменніцкай — прачытай гэту мудрую казку.

Мы паклапаціліся і пра тое, каб змясціць у слоўніку тыя словы, з якімі ты сустрэнешся ў падручніках па мове і чытанні, і тыя, якія ёсць ва ўрыўках-ілюстрацыях. Шукай іх па алфавіце.

У слоўнік не ўключаліся словы зусім аднолькавыя па напісанні і па значэнні (брат, дом, зіма, снег, трава) ці толькі з чыста арфаграфічным адрозненнем (варона — ворона; сняжынка — снежинка).



www.kamunikat.org

Не прыводзяцца словы з памяншальна-ласкальным значэннем (ветрык, сонейка).

Словы, аднолькавыя па гучанні і напісанні, але розныя па значэнні, падаюцца асобна і памячаюцца лічбамі:

**Гасцінец[1] — подарок.**

**Гасцінец[2] — дорога, большак, тракт.**

Усе значэнні мнагазначных слоў падаюцца ў адным слоўнікавым артыкуле-абзацы і памячаюцца лічбамі з дужкай:

**Вырай — 1) цёплы край, куды адлятаюць птушкі на зіму;**
**2) чарада пералётных птушак.**

Калі дзеясловы ў беларускай і рускай мовах адрозніваюцца асаблівасцямі ў кіраванні, пры іх даюцца склонавыя пытанні:

**Дзякаваць** *(каму)* **— благодарить** *(кого).*

Для перакладу беларускага слова ў большасці выпадкаў даецца адно рускае.

Калі ж слова перакладаецца некалькімі рускімі, то на першае месца ставіцца найбольш адпаведнае па значэнні і больш ужывальнае. Словы ў такіх выпадках аддзелены адно ад другога коскай, больш аддаленыя па значэнні кропкай з коскай:

**Набракаць — набухать, разбухать.**

**Асабісты — личный; персональный.**

**Жадаем поспехаў!**

**УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ**

= тлумачэнне слова

* значэнне слова ў кантэксце

♦ прыказкі, прымаўкі



www.kamunikat.org

# А



**Абабак — подберёзовик.**

Вось абабак з хітрай позай,
Што схаваўся пад бярозай
У высокую траву, —
Падбярозавік завуць.
*Уладзімір Мазго*

**Абавязак — обязанность, долг.**

Старанна вучыцца — абавязак школьніка.

**Абапал — 1) с обеих сторон; 2) по обеим сторонам.**

**Абаранак — баранка, бублик.**



**Абараняць — защищать.**

Служыць у войску мой брат,
Абараняе Айчыну.
Ён — Беларусі салдат,
Мужны, сапраўдны мужчына.
*Кастусь Жук*

**Абарона — оборона; защита.**

**Абвясціць — объявить.**



Верабейка абвясціў:
— А я проса малаціў!
Найпрыемнейшы занятак —
Дзюбкаю лічыць зярнятак.
*Іван Мураўейка*



www.kamunikat.org

# А

**Абедзве — обе.**

**Абібок — лентяй, лоботряс.**

У бычка баліць бачок —
Адляжаў бачок бычок,
На другі б крутнуўся бок,
Ды ляжыць, бо абібок.

*Кастусь Цвірка*



**Абмяркоўваць — обсуждать, обдумывать.**

Што рабіць? Хто дасць параду?
Мышкі склікалі нараду.
Абмяркоўвалі пытанне
Ад паўночы да світання.

*Уладзімір Дубоўка*

**Або, альбо — или, либо.**

**Абодва — оба.**

Абодва родныя браты,
Але не маюць магаты*,
Хаця б калі-небудзь
сысціся. *(Вочы)*

*Уладзімір Паўлаў*

* Магата — возможность.

**Абрус — скатерть.**



Быццам белы снег на дол,
Пакрывалам лёг на стол.
Рады госцю беларус,
Засцілаючы... *(абрус).*

*Уладзімір Мазго*

**Абурацца — возмущаться.**

**Абутак — обувь.**



www.kamunikat.org

**Абы — лишь бы, только бы.**

**Авадзень — овод.**

Авадзень гудзе ўвесь дзень.
Усім абрыдзеў* авадзень:
За цялятамі ганяецца,
За каровамі ганяецца
І кусаецца, кусаецца.



*Іван Муравейка*

* Абрыдзець — надоесть.

**Авалодаць — овладеть.**

**Агарод, гарод — огород.**

Што за месцейка за хаткай,
Дзе ўвіхаецца бабуля?
Родзяць там гарох, цыбуля,
Кроп і морква цэлы год.
Гэта месца — агарод.

*Уладзімір Мацвеенка*





**Агародніна — овощи.**

Агародніна зжаўцела, Пiць
вадзіцы захацела, Чутны жальбы
буракоў, Памідораў, агуркоў,
Морквы, рэдзькі, маку, дынь: —
Ой, памром мы без вады!



*Віктар Шымук*







www.kamunikat.org

**Агрэст — крыжовник.**

Агрэст садзіла я вясной,
Ён ладзіць не хацеў са мной.
Ну і было ж турботы з ім, —
Скалоў мне рукі ён зусім!
Хоць шмат я зведала турбот,
Затое смачны быў кампот.

*Авяр'ян Дзеружынскі*



**Агульны — общий.**

**Агурок, гурок — огурец.**

А Пятрок малады
Віп'е возера вады.
Так і цягнецца ў цянёк
Шалапутны блазан.

Каб далека не ўцёк, За
нагу прывязан. Гэта я
заву Пятрок, А наогул —
агурок.

*Рыгор Барадулін*

**Адбывацца — происходить.**

**Адважны — отважный.**

**Адвячорак — предвечернее время, сумерки.**

**Адгукнуцца — отозваться.**

**Адданы — преданный.**

**Адзенне, адзежа — одежда.**

Шапку, шалік, рукавічкі
Я вязала для сястрычкі.
А цяпер я буду рада
Змайстраваць адзенне брату.

*Таццяна Мушынская*






www.kamunikat.org

# А

**Адзнака — оценка.**

І яшчэ адзін урок
Ты запомні, галубок:
Пяць — адзнака як адзнака,
Толькі ведаў — кот наплакаў.

*Васіль Зуёнак*

**Адзначаць — отмечать.**

**Адказаць — ответить.**



Хто найродны самы ў свеце
І найлюбы самы?
Адкажыце дружна, дзеці:
— Мама! Мама! Мама!

*Уладзімір Паўлаў*

**Адклад — отлагательство.**

**Адкуль — откуда.**

**Адліга — оттепель.**

Ен у адлігу нарадзіўся,
Рос і вырас у мароз.
Прыгрэла сонца — праслязіўся
І сцёк увесь ракою слёз. *(Лядзяш)*

*Казімір Камейша*

**Адметнасць — особенность.**

**Адмыслова — особенно; безупречно.**

**Аднак — однако.**

**Аднойчы — однажды.**



Кожны дзень каля ракі
Ходзяць страшныя ваўкі.
Хто з імі сустракаецца —
Дадому не вяртаецца!
Я і сам ледзь-ледзь аднойчы
На абед не трапіў воўчы.

Добра, што ля рэчкі Бегал
і авечкі. На мой крык
прымчалі І ваўкоў
прагналі!

*Алесь Бадак*





www.kamunikat.org

**Аднолькавы — одинаковый.**

**Адняць — отнять.**

**Адолець — одолеть, осилить.**

**Адпаведна — соответственно.**

**Адпачываць — отдыхать.**

Пальчык з пальчыкам сябруе,
Пальчык пальчыка шануе.
Усе разам — працаваць,
Разам і адпачываць. *(Пальчаткі)*
*Ніна Галіноўская*



**Адразу — сразу.**

**Адрына — сеновал.**

= Халодная будыніна для кармоў і гаспадарчых прылад; пуня.

**Адтуліна — отверстие.**

**Адчыніць — открыть, отворить.**

Пойдзем, дзеці, у лес вясновы,
Нібы ў дом вясёлы, новы.
Толькі тым, хто ў казку верыць,
Лес свае адчыніць дзверы.
*Леанід Дайнека*

**Адшукаць — отыскать.**

— Гэта стукае мядзведзь.
Адшукаў ваш дом я ледзь.
Гаварыла мне сарока,
Што жыве тут недалёка,



Быццам сын у вас гультай, На ўсе просьбы толькі "Ай! Не хачу! Не буду! Потым!". Трэба гнаць з я го ля ноту.
*Алесь Бадак*



www.kamunikat.org

# А

**Ажына** — **ежевика.**



Ажына — маліны сястра,
Карычнева-сіняя ў лесе.
Дзядуля зазначыў: — Пара! —
І слоік на пояс падвесіў.

*Хведар Гурыновіч*

**Аздобіць** — **украсить.**

**Азірацца** — **оглядываться.**

АКНО́, мн. вокны — окно.

**Акрайчык, акраец** — **горбушка; краюха.**



Вам прынёс сягоння зайчык
Хлеба лустачку, акрайчык.
Дзе раней быў — невядома,
А цяпер акрайчык дома.

*Галіна Каржанеўская*

**Акуляры** — **очки.**



Што там свеціцца, як фары?
Носіць філін акуляры.
Кажа: — Факт... Яны мне любы,
Не зляцяць ніколі з дзюбы.

*Артур Вольскі*

**Акурат** — **точь-в-точь.**

**Аладка** — **оладья.**

— І самі знайце свой парадак,
Каб і да кніг, як да аладак,
Таксама дружна налягалі.

*Якуб Колас*

**Але** — **но.**

www.kamunikat.org

# А

**Алей — растительное масло.**

**Алейны — масляный.**

**Аловак — карандаш.**

Як наш дом я маляваў,
Дык алоўкі ўсе спісаў,
Паглядзіце, вокнаў колькі,
Іх, напэўна, болей ста...
Ён у нас такі высокі — Не
хапіла мне ліста!

*Іван Муравейка*



**Альтанка — беседка.**

**Амапь — почти; едва не.**

**Аматар — любитель.**

Наш Максім — рыбак заўзяты,
Печкуроў лавіць аматар.
Для яго рыбалка — свята:
Чарвякоў капае... тата.

*Алесь Пісьмянкоў*

**Ануча — 1) тряпка; 2) портянка.**

**Апавяданне — рассказ.**

**Апалонік — разливательная ложка, поварёшка.**

**Апенька — опёнок.**

Ён стаіць сярод бяроз,
Пень стары, амшэлы*,
Скрозь апенькамі зарос,
Як шчацiннем шэрым.
Пень глядзіць на грыбнікоў,
Бы з надзеяй-верай:
— Пастрыжы хто-небудзь зноў,
Я зарос не ў меру.

*Пятро Саковіч*



* Амшэлы — поросший мхом.

*Апенька* ф



www.kamunikat.org

Вось апостраф. Гэта — знак.
Вельмі важны ён, аднак,
*З'езд, пад'езд* — напішаш проста,
Калі ўспомніш пра апостраф.

*Артур Вольскі*




**Апранацца — одеваться.**

**Апячы — обжечь, ожечь.**

**Араць — пахать.**

♦ Хто арэ ды сее, той малоціць ды вее.
(Что посеешь, то и пожнёшь.)



**Арэлі, гушкалка — качели.**

Мы акрэплі, загарэлі
І за вёскай, між бяроз,
Так разгушквалі арэлі,
Што ўзляталі да нябёс.

*Мікола Маляўка*

**Асабісты — личный; персональный.**

**Асаблівы — особенный.**

**Асака — осока.**

**Асілак — богатырь.**

Хай ты асілак-чэмпіён
Ці знакаміты чараўнік,
Яе не скруціш у рулон
І не паставіш да сцяны. *(Дарога)*
*Іван Муравейка*



www.kamunikat.org

**Астатні — 1) остальной; 2) последний.**

**Асцярожна — осторожно.**

Праз дарогу поўз жучок,
Павярнуўся на бачок.
Калі ласка, асцярожна —
Наступіць на крыльцы можна.
*Ніна Галіноўская*



**Атрымацца — получиться.**

**Атрымаць — получить.**

Я адкрыю першы клас… Дзе ён будзе? Дома ў нас!
Лялькі мараць атрымаць Толькі "дзесяць", а не "пяць".
*Таццяна Мушынская*

**Аўторак — вторник.**

**Ахвочы — падкий, охочий.**

**Ахвяра — жертва.**

А авадзень ашалела гудзе
І вывіжоўвае* вокам —
Якую хутчэй яму высачыць дзе
Ахвяру непадалёку.
*Васіль Вітка*

* Вывіжоўваць, віжаваць — выслеживать, высматривать.

**Ахоўваць — охранять.**

Ахоўвае звяроў
У пушчы, як сяброў,
І іх да цёплых дзён
Падкормлівае ён. *(Егер)*
*Мікола Маляўка*





www.kamunikat.org

# Б



**Бабуля — бабушка.**

Маміна мама — бабуля мая.
З ёю сябрую маленькая я.
Добра з бабуляй. Цікава заўжды.
Ніякай самоты, ніякай бяды.
*/Іеанід Пранчак*

**Бавоўна — хлопок.**

Месяц студзень — свята ў будзень.
Шар зямны ад снегу белы,
Як бутон бавоўны спелы.
*Данута Бічэль-Загнетава*

**Багародзіца — Богородица.**

= Дзева Марыя, Маці Ісуса Хрыста, Маці Божая.

Багародзіца — заступніца нябесная ўсіх хрысціян.

**Багата — 1) богато, зажиточно; 2) много**



А для дзяцей найбольша свята,
Абы наесціся багата.
*Якуб Колас*

**Бадай — почти, пожалуй.**

**Бадзёры — бодрый.**

**Баль — бал.**

**Баляваць — пировать.**

www.kamunikat.org

# Б

**Баравік — белый гриб; боровик.**

Кош не кош у грыбніка,
Як няма баравіка!
*Васіль Зуёнак*



**Баравы — боровой.**

**Барвовы — багровый, багряный.**

**Басанож — босиком.**
**Бацька — отец.**

**Бацькі — родители.**

Дзетак вывезлі бацькі
Адпачыць на дачы
Ды каб вопыт хоць які
Даць ім гаспадарчы.
*Пятро Саковіч*



**Бачыць — видеть.**

Сам сябе ён перайначвае*.
Вы, канечне, гэта бачылі?
Хто ж не бачыў, дык убачыць:
То як серп ён, то як мячык. *(Месяц)*
*Іван Муравейка*

* Перайначваць — изменять.



**Бегчы — бежать.**

Крылы мае — не лятае.
Галаву ў пясок хавае.
А як бегчы пусціцца,
Ні кому не папусціцца*. *(Страус)*
*Уладзімір Паўлаў*

* Папусціцца — уступить, поддаться, проиграть.



www.kamunikat.org

# Б

**Бездакорны — безупречный, безукоризненный.**

**Біблія — Библия.**

= Святое Пісанне, зборнік старажытных свяшчэнных кніг (Стары і Новы запаветы).

**Благі, кепскі — плохой.**

Праганяй благія словы,
Як ідзеш у храм Хрыстовы!

*Рыгор Барадулін*

**Блазан — шут, клоун.**

**Блакіт — голубизна, лазурь; синева.**

**Блакітны — голубой.**

Блакітная рэчка, узлесак высокі,
Празрыстае неба, у небе — аблокі.

*Васіль Вітка*



**Блішчаць — блестеть, сверкать.**

Раніцою, як слязінкі,
На траве блішчаць расінкі.

*Міхась Пазнякоў*

**Блукаць — 1) бродить; 2) блуждать, плутать.**

Беленькі козлік ля рэчкі блукае.
Ціхенька-ціха сястрыцу гукае.
Чуе з вадзіцы голас ён тонкі,
Голас любімай сястрыцы Алёнкі.

*Ніна Галіноўская*



**Блыха,** *мн.* **блохі — блоха.**

**Бляшанка — жестянка.**

**Бо — потому что; ибо.**



www.kamunikat.org

# Б

**Бог — Бог.**

= Паводле Бібліі, найвышэйшая духоўная сіла.

Кажа сябар, што я здольны
Вельмі ў тэнісе настольным.
— Талент дадзены ад Бога,
Абыграеш ты любога.
Трэніруюся штодзённа —
Хутка стану чэмпіёнам!

*Уладзімір Мазго*

**Бойка[1] — драка.**

**Бойка[2] — маслобойка.**

**Бойка — бойко.**

**Бот — сапог.**

— Бусел, бусел, дай мне боты
Перабрацца праз балоты.
— Ботаў, ліска, не прасі ты,
Бо да ног яны прышыты.

*Ніна Галіноўская*



**Борзда — быстро, проворно.**

**Бохан — буханка хлеба; каравай.**

А з печы бохан вымеш — ён ружовы,
Як жнівеньскага сонца дыск барвовы.

*Уладзімір Дубоўка*



**Бруд — грязь.**

А мурзаты парсючок
Аб штыкет пацёр бачок,
Мухам і акружаны,
Сігануў да лужыны:
Пакачаўся ў брудзе —
Вось і чысты будзе!..

*Васіль Зуёнак*



# Б

**Бруіцца — струиться.**

**Брыво** *Н.₁ мн.* **бровы — бровь** *ж.*

**Будаваць — строить.**

Бабры — спакойныя звяры;
Хвасты ў іх як лапаты.
Без сякераў, піл бабры
Сабе будуюць хаты.
Ля іх, нібы разбойніца,
За язем выдра гоніцца.
*Алесь Якімовіч*

**Будаўнік — строитель.**

Імчалі па шашы грузавікі.
Узводзілі палац будаўнікі.
*Уладзімір Корбан*

**Будоўля — стройка.**

Як кашом, сваім каўшом
Выбірае грунт пад дом
Пастаянны завадатар
На будоўлі — экскаватар.
*Уладзімір Мазго*



**Бульба — картошка, картофель.**

Ёсць яшчэ такая дзе,
Адкажыце, птушка? Яйкі ўсе
ў зямлю кладзе Хітрая
нясушка.

Вочы ўзрадуе твае, Ні
прыйшоў адкуль бы. Шмат
і ў горадзе яе —
Беларускай бульбы.
*Рыгор Барадулін*

**Бульбяны — картофельны.**



www.kamunikat.org

# Б

**Бурак — свёкла.**



Не сыдзе з месца ні на крок,
Зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ветрык незнарок
Ягоную чупрыну.
- А возьмуць за чупрыну
Ды выцягнуць з пярыны —
Пачырванее, небарак.
Вядома, хто гэта — бурак!

*Рыгор Барадулін*



**Бусел — аист.**

Над балотамі клякоча —
У любві прызнацца хоча,
Мабыць, роднай Беларусі.
Называюць птушку — бусел.

*Уладзімір Мазго*

**Быццам, бы — будто, как будто; словно; точно.**

Жыў у сажалцы карась,
Што любіў зарыцца ў гразь.
Як зарыўся ён пад корч —
Дзень зрабіўся быццам ноч...

*Уладзімір Мазго*

**Бязмежжа — безграничный, бескрайний простор.**

**Бялізна — бельё.**

**Бяседа — пір; застолье.**

**Бяспека —**



www.kamunikat.org

# В

**Вабіць** — **привлекать.**

**Вавёрка** — **бёлка.**

Назбірала арэхаў
Пяць мяхоў і паўмеха,
Насушыла грыбоў
Аж дванаццаць карабоў,
Нацягала шышак горку
Працавітая вавёрка.

*Васіль Зуёнак*



**Вадкасць** — **жидкость.**

**Вадзянік** — **водяной.**

Лесуны выходзяць з нетраў
І русалак карагоды.
Вадзянік і сорак ветраў
Там з'яўляюцца заўсёды.

*Уладзімір Дубоўка*



**Вакол** — **вокруг.**

**Валодаць** — **владеть.**

**Валошка** — **василёк.**

**Вандраваць** — **путешествовать.**

Вандраваў па родным краі
І лятаў за акіян,
А цяпер адпачывае
Дома татаў чамадан.

*Мікола Маляўка*

**Вандроўка** — **путешествие.**



www.kamunikat.org

# В

**Вантрабянка — домашняя ливерная колбаса.**

**Варажыць — гадать; предсказывать; колдовать.**

**Варожы — 1) недоброжелательный; 2) вражеский.**

**Варта[1] — караул, охрана.**



Ні скарынкі, ні зярнятак
Для маленькіх мышанятак
Нельга больш здабыць у хаце,
Бо заўжды там кот на варце.
*Уладзімір Дубоўка*

**Варта[2] — стоит, следует.**
Пасля працы варта і адпачыць.

**Вартаваць — охранять, караулить, стеречь, сторожить.**

Не брэша, як сабачка,
Але вартуе дачу,
У дом твой без ключа
Не пусціць і ўрача. *(Замок)*
*Уладзімір Мазго*



**Вартаўнік — сторож.**

**Варты — достойный; стоящий.**

**Варушыць — шевелить.**

**Васілёк** — тое, што **валошка.**



Ці бачылі ў жыце ці ў полі ўлетку
Блакітную кветку?
Усміхаецца здалёк —
Гэта кветка васілёк.
*Уладзімір Мацвеенка*



www.kamunikat.org

# В



**Вёдаць — знать.**
Твар румяненькі,
Белая хустачка.
Я ўжо ведаю:
Я — беларусачка.
*Алесь Бадак*

**Вёды — знания.**
Дом-палац стаіць высокі.
Нашых ведаў там вытокі.
Радасць свеціцца наўкола.
Ну вядома, гэта — школа.
*Уладзімір Мазго*




**Вёжа — башня.**

**Вёйка — ресница.**

**Вёка — крышка.**
Века ўзняў ён нецярпліва, А
пад ім — такое дзіва!..
*Уладзімір Дубоўка*

**Вёльмі — очень.**
А было аднойчы так: З рэчкі
вынырнуў шчупак. Пасядзеў
крыху на сушы І прамовіў,
уздыхнуўшы: — Тут, вядома,
хараша, Толькі вельмі горача!
Смачна пазяхнуў І назад
нырнуў.
*Алесь Бадак*





www.kamunikat.org

**Верабей — воробей.**

Ля сенцаў верабей —
Скача, скача, скача...
Думае, што так цяплей,
Думае, што так хутчэй
Напаткаць удачу.

*Таццяна Мушынская*



**Вёрас — вереск.**

Замоўклі птушак галасы,
І пахне свежым верасам.

*Мікола Хведаровіч*

**Вёрасень — сентябрь.**

♦ Халодны верасень, але сыты.

**Вераснёвы — сентябрьский.**

**Верш — стихотворение.**

**Вёстка — известие, весть.**

**Ветлівы — вежливый.**

**Веска — деревня.**

**Відэлец — вилка.**

За стол садзяцца ўсе ў парадку
І прад сабой кладуць аладку,
Відэльцы, лыжкі разбіраюць
І стравы першае чакаюць.

*Якуб Колас*



**Вільгаць — влага.**

www.kamunikat.org

**Віншаваць — поздравлять.**

— Ну, вось і дома, дзякуй Богу! —
Прыйшлі ў хату, усіх цалуюць,
З святым Вялікаднем віншуюць.

*Якуб Колас*

**Вір — омут, водоворот.**



— Не хадзіў бы ты, сынок,
На глыбокі вір купацца,
Бо нырнеш і незнарок
Можаш там на дне застацца.

*Іван Мураўейка*

**Вітапыня — прихожая.**

**Вітаць — приветствовать.**

— Хто гэта лісця нанізаў
На вострыя іголкі?
А вожык Васю так сказаў:
— Вітаю вас, Вясёлкін!

*Васіль Вітка*

**Водар — аромат.**

Красачкі рамонку-тату
Гаварылі пасля ночкі:
— Так шкада, што не лятаем
Мы, як тыя матылёчкі!
— Хто прыдумаць мог такое,
Быццам не лятаюць кветкі?!
Мы лунаем над зямлёю,
Водар — нашы крылы, дзеткі!

*Васіль Жуковіч*





www.kamunikat.org

# В

**Вожык — ёж.**



Вожык з-пад верасу выгнаў вужаку.
Лезе вужака на дрэўца ад жаху.
*Артур Вольскі*

**Волат — великан, богатырь.**

Ці не бачылі вы дзе волата такога:
Рукі, ногі — у вадзе, на спіне — дарога? *(Мост)*
*Міхась Пазнякоў*

**Вопратка — верхняя одежда.**



Распраналі, разувалі
У спальні нашага Сымона.
Кветку шчасця ўсе шукалі
Ва ўсёй вопратцы ягонай.
*Уладзімір Дубоўка*

**Вопыт — опыт.**

= Набытыя веды і навыкі. Жыццёвы вопыт

**Воўна — овечья шерсть.**

Бегаў зайчык па сумётах,
Пагубляў панчошкі.
Акалелі, азалелі*
Зайчыкавы ножкі.
Трэба воўну шукаць,
Ніткі прасці і сукаць**,
Трэба зайчыку вязаць
Новыя панчошкі.



*Васіль Зуёнак*

* Акалёць, азалёць — *тут:* замёрзнуть.
** Сукаць — сучить (скручивать в одну нить).



www.kamunikat.org

# В

**Вочы — глаза.**

Вялікія вочы ў страха,
Яшчэ большыя — у Стаха.

*Мікола Маляўка*



**Вуда — удочка.**

Рыбак заядлы Гоша,
Ён з вудай у руцэ

Сядзець да зорак можа, А
рыбка — у рацэ.

*Яўген Хвалей*

**Вучаніца — ученица.**

**Вўчань — учен й к.**

**Вўха — ухо.**

**Выгінаць — вигибать, изгибать.**

**Выгляд — вид.**

Гарбуз паласаты сядзіць каля хаты
I грэе на сонцы бакі.
Вялізны, таўсматы, на семкі багаты,
На выгляд — забаўны такі.

*Леанід Пранчак*



**Вызвал я ць — освобождать.**

**Выкарыстаць — использовать, употребйть.**

**Выключны — исключительный.**

**Вымаўляць — выговаривать, произносить.**

**Выпадак — случай.**

Выпадак быў дужа рэдкі:
Воўк зайцу звязаў шкарпэткі

*Рыгор Барадулін*



# В

**Вырай — 1) юг.**

= Цёплы край, куды адлятаюць птушкі.

**2) стая перелётных птиц.**

**Выратаваць — спасти.**

Падхапіліся каровы —
У кусты ляцяць, у сховы.
Там іх выратуе цень,
Бо з'явіўся... *(авадзень).*

*Уладзімір Паўлаў*



**Выспець — вызреть, созреть.**

Сонца пячэ, Збожжа выспявае —
Л і па цвіце, Кал і гэта бывае? *(Летам)*

**Выток — 1) исток.**

= Месца, адкуль выцякае рака, ручай.

**2) начало, первоисточник.**

= Пачатак нечага.

**Выхоўваць — воспитывать.**

**Вядома — 1) известно; 2) конечно, безусловно.**

**Вялікі — большой.**

**Вялікдзень — Пасха.**

= Рэлігійнае свята, прысвечанае ўваскрэсенню Ісуса Хрыста.

Заўтра свята ў хату прыйдзе.
Колькі ночанькі тае?!
Будзе радасным Вялікдзень
З кулічамі на стале.

*Леанід Пранчак*





www.kamunikat.org

# В

**Вяртацца — возвращаться.**

Трава на ўзгорках вырасла,
Вярба цвіце над беражком.
Якая птушка з выраю
Вяртаецца пяшком? *(Драч)*
*Мікола Маляўка*

**Вясёлка — радуга.**



Хто нябачнаю рукою
Мост малюе над ракою
З розных колераў вясёлых?
А завуць той мост — вясёлкай.
*Кастусь Жук*

**Вяршю — сливки.**

Плітка шакаладу фабрыкі "Спартак":
Незвычайны водар, незабыўны смак.
Цукар і какава, ванілін, вяршкі —
Разам утвараюць шакалад такі.
*/Іеанід Пранчак*

**Вячэра — ужин.**



Ляцелі дзве цяцеры,
Шукаючы вячэры,
Глядзелі зверху ўніз.
І раптам бачаць: ліс
Ім лапаю махае,
У госці запрашае.
*Анатоль Грачанікаў*

**Вячэраць — ужинать.**

Наша Юля — гаспадыня.
Не, вячэра не астыне!
Лялек садзіць ля стала,
Бо вячэраць ім пара.
*Таццяна Мушынская*

www.kamunikat.org

# Г

**Гадаваць — 1) растить, воспитывать;**

**2) отращивать, отпускать.**

Нават птушкі жыць не хочуць лёгка —
Гнёзды ўюць, гадуюць птушанят.
*Віктар Шымук*



**Гадзіна — час.**

Дзіва дзіўнае — хвіліны:
Як сышліся ў круг адзіны,
Стаў і ўраз яны гадзінай!
*Мікола Чарняўскі*



**Гадзіннік — часы.**

**Гаіцца — 1) заживать; 2) заживляться.**

Назбіралі пер'я, пуху,
Каб шпаку цяплей было,
Каб было заўсёды суха,
Каб гаілася крыло.
*Сяргей Грахоўскі*



**Гай — роща.**

У гаі ля вузкай сцежкі
У мох прыселі сыраежкі,
Жаўтавокія лісіцы
Паглядаюць з-пад ігліцы. На пяньках, нібы паненкі,
Важна ўселіся апенькі.
*Уладзімір Мазго*

**Гайдацца, гойдацца — качаться, колебаться.**



www.kamunikat.org

# Г

**Галіна — ветка.**

**Гаманіць — 1) разговаривать.**

**2) полниться шумом, звуками, щебетом.**

За акном гамоніць ранне Гэта для маёй дачушкі
Галасістым шчабятаннем. Слаўна так спяваюць птушкі.

*Ніна Галіноўская*

**Ганак — крыльцо.**



Выйшаў на ганак з палаца вяльможны* —
Сэрца сялянскае б'ецца трывожна.

*Уладзімір Дубоўка*

* Вяльможны — *тут:* пан.

**Ганарлівы — горделивый, спесивый.**

♦ Ганарлівы ды ўпарты нічога не варты.

**Ганаровы — почётный.**

**Ганарысты — высокомерный, надменный.**



Калісьці ў старадаўні час
Жыў ганарысты пан у нас.
Хоць ганарыстымі яны
Былі тады ўсе паны,
Але вось гэты — горш за ўсіх.
Яго празвалі Васпан Пых.

*Уладзімір Дубоўка*

**Гандбол — гандбол.**

= Камандная гульня ў ручны мяч.

Як заўсёды, наша школа Так ручны завецца мяч,
Сёння славіцца гандболам. Выйграём за матчам матч.

*Уладзімір Мазго*

www.kamunikat.org

# Г

**Ганіць — 1) охаивать; 2) хулить; осуждать.**

= Прызнаваць непрыгодным, дрэнным; асуджаць.

**Гарачыня — жара; зной.**

**Гарбата — чай.**

**Гарбуз — тыква.**

**Гарката — горечь.**

**Гарлачык — кувшинка, водяная лилия.**

Хто не знае, хто не бачыў
Кветку-доктара — гарлачык!
Карнявішча як аптэка:
Вітаміны ёсць і лекі,
Нібы ў бульбіне, нямала
У ім бялюткага крухмалу...
Вось бы наварыць галушак! —
Ды вада агонь затушыць.
*Васіль Зуёнак*



**Гаршчок,** *мн.* **гаршкі — горшок.**

**Гарэза — озорник; озорница.**

**Гаспадар — хозяин.**

Людская праца — уладар!
Я на на свеце гаспадар.
*Уладзімір Дубоўка*

**Гаспадарыць — хозяйствовать, хозяйничать.**

**Гаспадыня — хозяйка.**

Гаспадыні гэтай дома не да сну —
Садзіць бульбу людзям, сее збажыну. *(Вясна)*
*Мікола Маляўка*

www.kamunikat.org

# Г

**Гасподзь — тое, што Бог.**

**Гасцінец[1] — подарок.**



У хусцінцы — тры гасцінцы:
Табе, братка, шакаладка,
Табе, дружок, піражок,
А сястрычцы — тваражок.

*Васіль Вітка*

**Гасцінец[2] — дорога, большак, тракт.**

Кот, Мурашка і Лісіца
Маршыруюць па гасцінцы.
Крочаць весела і жвава —
У дарозе ўсё цікава.

*Уладзімір Дубоўка*

**Гасцінны — гостеприймный, радушный**

**Гаючы — целебный.**

**Глеба — почва.**



Кінь вясной у глебу зерне —
Дык увосень жменю верне!

*Уладзімір Дубоўка*

**Глей — ил.**

Без аглядкі не вылазь
З глею цёмнага, карась,
Бо стаіць зусім не так
За карчагаю... *(шчупак).*

*Уладзімір Паўлаў*

**Глушэц — глухарь.**

**Глыбіня — глубина.**



www.kamunikat.org

**Гляк — горшок с узким горлышком.**

**Гмах — громадина, махина.**

**Годнасць — достоинство.**

**Гожы — 1) красивый; 2) годный, пригодный.**

Важны, гожы той, катары
Не здымае й нанач шпоры.
Ён ад важнасці свае
Тры разы на ноч пяе. *(Певень)*
*Уладзімір Паўлаў*



**Гоман — шум, щебет, разговор.**

**Горш — хуже.**

**Горшы — хуже; худший.**

♦ Хто з каго смяецца, той горшым астаецца.

**Града — гряда.**

**Грак — грач.**

**Грашавіты — денежный, имеющий много денег.**

У старога вераб'я
Грашавітая сям'я:
У кожнага верабейкі —
Па чатыры капейкі.
Зляцеліся вераб'і —
Налічылі два рублі.
Колькі ж мае дзяцей
Наш багаты верабей?
*Васіль Вітка*



**Грэбень — 1) грёбень, расчёска; 2) гребешок** (у птиц).

www.kamunikat.org

# Г

**Грэбці — грести.**

**Губляць — терять; тратить.**

Коцік часу не губляе,
Мышку ў норку заганяе.
*Анатоль Астрэйка*



**Гузак — шишка.**

Упаў гусак — набіў гузак
Сабе на лбе. А мо — табе?
*Уладзімір Мазго*

**Гўзік — пуговица.**

Яна там, дзе шыюць
І дзе вышываюць,
Дзе гузік згубіўся,
Дзе латку ўстаўляюць. *(Іголка)*
*Іван Муравейка*

**Гук — звук.**

**Гукаць — 1) звать; 2) аукать.**

**Гульня — игра.**

**Гультай — лентяй, лодырь, бездельник.**

Лежань лежма ляжыць,
Седзень седнем сядзіць,
Крыкун крыкма крычыць,
Гультай гульма гуляе,
Абібок бок абівае.
*Васіль Вітка*



- Гультай не чалавек, балбатун не гаспадар.
- У гультая і страха цячэ і печ не пячэ.

www.kamunikat.org

# Г

**Гуляць — играть.**

Вожыкі ў футбол гуляюць,
Яблык, быццам мяч, ганяюць.
Вожык-тата — варатар,
Адаб'е любы ўдар!

*Таццяна Мушынская*





**Гўмар — юмор.**

**Гумарэска — юморёска.**

= Невялікі твор гумарыстычнага характару

**Гўмка — резинка, ластик.**

**Гўрба — сугроб.**

Хутка збег мароз. Адліга —
Быццам гора, быццам ліха!
Снегавік наш плакаць стаў.
Гурбай стаў — і ўміг растаў.

*Таццяна Мушынская*

**Гурт — ватага.**

**Гўртам — сообща, вместе.**

**Гусак — гусь.**

**Гусь** ж. — **1) гусь** м.; **2) гусыня** (самка гуся).

**Гутарка — беседа.**

**Гучаць — звучать.**

Вось гучыць сігнал трывогі.
Пэўна, з "хуткай дапамогі"?

*Таццяна Мушынская*




**Гўшкацца — качаться** (на качелях).

**Гушчар — чаща, гуща.**

www.kamunikat.org

# Д



**Дабрадзёй — благодетель.**

= Той, хто робіць дабро.

**Даволі — довольно.**

Заглянула сонца ў вочкі,
Дзень прыйшоў — даволі сну!

*Уладзімір Дубоўка*

**Даглядаць** *(каго, што)* — **заботиться** *(о ком, о чём),* **ухаживать** *(за кем, за чем).*

**Дадаць — 1) добавить; 2) прибавить.**

**Дадому — домой.**

Бывайце здаровы, жывіце багата,
А мы ад'язджаем дадому, дахаты.

*Ісак Лобан*



**Даёнка — подойник.**

Да самых краёў сырадой
Запеніцца ў звонкай даёнцы.

*Мікола Аўрамчык*

**Дажджлівы — дождливый.**

**Дазваляць — разрешать.**

Цёплае, ласкавае, свеціць, ажыўляе,
На сябе глядзець нам не дазваляе. *(Сонца)*

*Міхась Пазнякоў*



www.kamunikat.org

# Д

**Даймаць** — **донимать, изводить, допекать.**

Прыйдзе ранак, мы — пад душ.
Не даймае спёка й суш!
*Таццяна Мушынская*



**Дакараць** — **упрекать.**

Зебра зебру дакарала:
— Мала траўкі ты нарвала.
Будуць румзаць зебраняты,
Што жывоцік пуставаты.
*Ніна Галіноўская*

**Дакладна** — **точно.**

Парасон не парасон,
І матрац дык не матрац.
А зляцеў з-пад неба ён
І дакладна сеў на пляц. *(Парашут)*
*Уладзімір Паўлаў*

**Дакўль** — **1) докуда; 2) до какого времени, доколь.**

**Дакучаць** — **надоедать.**

**Далеч** — **даль.**

**Далікатны** — **вежливый, обходительный хрупкий, нежный.**

Далікатны мае пах
І пялёсткі ў завітках.
Ды калючая задужа.
А завецца кветка... *(ружа).*
*Уладзімір Паўлаў*



**Дамовіцца** — **договориться; условиться.**



www.kamunikat.org

# Д

**Дамоў — тое, што дадому.**

**Дапамагчы — помочь.**

І ў жыцці, не толькі ў казках,
Лечаць нас спагада, ласка.
А воўчына варожасць —
Анідзе не дапаможа!
*Уладзімір Мазго*



**Дапамога — помощь.**

Трэба ваша дапамога:
Памірыць ката і дога.
*Алесь Пісьмянкоў*

**Дараваць** *(каму)* **— простить** *(кого).*

Пан пачынае размову такую:
— Грэх твой цяжкі я на гэтым дарую.
*Уладзімір Дубоўка*

**Дарадца, дарадчык — советчик.**

Пасля таты, пасля мамы
І людзей старэйшых
Яна ваш дарадца першы,
Самы наймудрэйшы. *(Кніга)*
*Уладзімір Паўлаў*



**Дарма — 1) напрасно, зря; 2) бесплатно, даром.**

♦ Дарма хадзіць — ногі адбіць.

♦ Каза ваўку дарма не скача. (Бесплатный сыр бывает только в мышеловке.)

**Дарослы — взрослый.**

**Дарэчы — кстати.**

**Дасягнуць — достичь.**



www.kamunikat.org

**Д**

**Даўжыня — 1) длина; 2) продолжительность.**

**Дах — крыша.**



Дах накрылі — не свіціцца
Там, у сіняве,
Дзе над самым домам ціха
Воблачка плыве.
Б'е пярун цяпер, бывае,
Навальніца — жах,
Ды і кропля дажджавая
Не праточыць дах.

*Мікола Маляўка*

**Дахаты — тое, што дадому.**

Так і вярнулася Наста дахаты,
Дзе нецярпліва чакаў яе тата.

*Уладзімір Дубоўка*

**Дачка — дочь.**

**Дачўшка — доченька.**

— Гора, дачушка, і скача і плача!
Новую пан адшукаў нам задачу.

*Уладзімір Дубоўка*



**Дбайны — заботливый; старательный; усердный.**

Хвастатая, рухавая,
Заўжды занята справаю.
Грыбоў, арэхаў горкі
У дбайнае ваверкі.

*Ніна Галіноўская*

**Дбаць — заботиться; стараться; усердствовать.**

♦ Хто дбае, той і мае. (Кто спит весной, плачет зимой.)



www.kamunikat.org

# Д

**Двойчы — дважды.**

♦ Скупы двойчы плоціць, а дурны двойчы ходзіць. (Скупой платит дважды.)

**Джала — жало.**

Не калі нас, пчолка,
Ты сваёй іголкай.

Пчолка адказала: — Не
іголка — джала. *Ніна*
*Галіноўская*



**Дзвёры — дверь.**

**Дзе — где.**

Дзе была, варона,
Варона-гулёна?

— Лятала на палетак За
кормам для дзетак. *Ні на*
*Галіноўская*



**Дзёля — ради, для; из-за.**

**Дзёсьці — где-то.**

**Дзёянне — действие.**

**Дзённік — дневник.**

Сніцца зайчыку капуста,
Сніць цялятка хлеба лусту.
А свавольніку Ігнатку
Сніцца ў дзённіку "дзесятка".

*Алесь Пісьмянкоў*

**Дзіва — чўдо, диво, невидаль.**

= Нешта незвычайнае, нечаканае, што здзіўляе, захапляе.

Адбылося раптам дзіва:
Сонца ход свой прыпыніла
I сваёй магутнай сілай
Той пясочак растапіла.

*Уладзімір Дубоўка*





www.kamunikat.org

# Д

**Дзівак — чудак.**

— Дзівак! — між сабой гаспадыні гавораць: —
Бярэ, што не трэба, патрэбнае — дорыць!

*Еўдакія Лось*

**Дзівіцца — удивляться, изумляться.**

Я і сам дзіўлюся, лёсу наракаю:
У вадзе сушуся, у печы намакаю. *(Воск)*

*Уладзімір Паўлаў*

**Дзіцячы — детский.**

**Дзік — дикий кабан, вепрь.**

Пад'еўшы ўволю жалудоў,
Па сцежцы лесавой
Іклaстых чарада дзікоў
Ідзе на вадапой.

*Алесь Якімовіч*



**Дзіравы — дырявый.**

**Дзірка — дырка.**

**Дзьмухавёц — одуванчик.**

Дзьмухавец адцвіў у садзе.
Жаль і смутак у паглядзе.
Ад нягоды азалелай*
Пухкі шарык — белы-белы.

Вецер вынырнуў з-за хмары,
Дзьмухнуў, і бялюткі шарык
Разляцеўся на часцінкі, На
малыя дзьмухавінкі.

*Леанід Пранчак*

* Азалёлы — замёрзший.

**Дзьмухаць — дуть, фукать.**

♦ Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае.



**Дзюба** — **клюв.**

Дзюбкаю ўрач стукае —
Трубкаю не слухае:
Тук-тук-тук,
Пэўна, чулі ў лесе стук?
Трошкі сціхне, памаўчыць
Ды і зноў пачне лячыць.

(Дзяцел)

*Уладзімір Мацвеенка*



**Дзядзька** — **дядя.**

Ведае дакладна Маша:
Госць жаданы — дзядзька Саша.
Брат ён Машынаму тату
І заходзіць часта ў хату.

*Яўген Хвалей*

**Дзядоўнік** — **репейник.**



**Дзядуля** — **дедушка.**

Мой дзядуля — ветэран,
Беларускі партызан.
Ён адважна ваяваў,
Перамогу здабываў.
Ён Радзіму вызваляў.

*Леанід Пранчак*

**Дзяжа, дзёжка** — **квашня, дежа.**

= Драўляная пасудзіна з прамых клёпак (для замешвання цеста, салення).

♦ Дзе сварацца ды п'юць, там мышы ў дзяжы жывуць.

**Дзякаваць** *(каму)* — **благодарить** *(кого).*

♦ Дзякуй не дзякуй, а заплаціць мусіш. (Из спасибо шапки не сошьёшь.)



www.kamunikat.org

# Д

**Дзякуй — спасибо.**

Пахне рана пірагамі, Дзякуй сонцу, дзякуй маме,
Кліча свята на парог. Дзякуй печы за пірог!

*Леанід Пранчак*

**Дзяружка — дерюжка.**

= Саматканая посцілка; пакрывала.

Саматканая дзяружка —
Дзіўныя ўзоры. Ткала любая
бабуля На дзяружцы зоры.

Як засцеле на канапу, —
Позірк не адвесці.
На цудоўныя ўзоры
Не рашуся сесці.

*Леанід Пранчак*

**Дзяўбці — клевать.**

**Дзяўчынка — девочка.**

Скача зайчык па паляне,
Веранічка — па дыване.

У дзяўчынкі сёння свята — Ёй
прынёс сабачку тата.

*Віктар Гігнін*

**Добразычлівы — доброжелательный.**

**Дождж — дождь.**

Доўга працаваў садоўнік:
Клён паліў, паліў дзядоўнік,
Вымыў травы і кусты,
І галінкі, і лісты.
Познім вечарам прагноз
Тэлевізар нам прынёс —
Заўтра зноў ён прыйдзе ўсё ж
Бо садоўнік гэты — дождж.

*Уладзімір Мацвеенка*

**Дол — низ; земля.**





# Д

**Досвіткам — на рассвете.**

**Доўгі — 1) длинный; 2) длительный** (во времени).

**Драбніца, дробязь — мелочь, пустяк.**

— Гэта, хлопчыкі, драбніца!
Ім адказвае Лісіца. —
Падраўняць знайду я сілы...
І кілбаскі адкусіла.

*Уладзімір Дубоўка*

**Дражніць — дразнить.**

**Дранік — драник.**
= Аладка, блін з дранай бульбы.

Для мяне і для ката
Страва з бульбы — смаката*!
Сёння мама раненька
Напякла нам дранікаў.

*Уладзімір Мазго*

* Смаката — вкуснятина.



**Драпёжнік — хищник.**

**Драўляны — деревянный.**

Поле шкляное, а межы драўляныя. *(Акно)*

**Дружбак — закадычный друг.**

**Друзачка — осколок.**

**Дрыгва — трясина, топь.**

**Дрэва — дерево.**

**Дрэнны — плохой, скверный.**

**Дубёц — хворостина, прут.**

**Дуброва — дубрава.**

**Дужа** — тое, што **і вёльмі.**



Як сышліся бараны —
Не пазбегнуць ім вайны.
Не пазбегнуць крыўд і ранаў,
Дужа ўпартыя яны.

*Таццяна Мушынская*

www.kamunikat.org

**Дўжы — сильный.**

Ён даўжэзны мае нос, Трубіць ім, як паравоз. Гэтым носам бервяно Падымае не адно.

А захоча — дык і дрэва Выкарчуе, калі трэба. Вось такі ён, дзядзька-слон. Ці не праўда, дужы ён?!

*Кастусь Жук*

**Дўмка — мысль; мнение; замысел.**

**Духмяны — душистый, ароматный.**

Чорны, чорны чыгунок
Грэўся ў печцы нашай.
Чорны, чорны чыгунок —
Ды з духмянай кашай.

*Таццяна Мушынская*



**Ды — и; но.**

**Дыбаць — идти, шагать.**

**Дыван — ковёр.**

Сніўся Пецю смачны сон:
На батоне ехаў ён.

Лётаў Сцёпка на бліне, Як на цуда-дыване.

*Васіль Зуёнак*

**Дык — то; так.**

Новы дзень над шумнай ніваю
Запаліў ужо зару.
Дык жыві свабоднай і шчасліваю,
Дарагая Беларусь!

*Алесь Бадак*



**Дыхтоўна — отлично.**

= Вельмі добра, высокай якасці, адмыслова.

# Е



**Ёжа — пища, еда.**

**Елка — ель, ёлка.**

**Енк — стон.**

Алесь заенчыў праразліва,
Упаў і зноў схапіўся жыва,
А дзеці ў плач, у енк, у слёзы, І ўсе
разбегліся, як козы.

*Якуб Колас*

**Есці — есть; кушать.**

Кліча мама Жаба дзетак:
— Напякла я вам катлетак,
Смачнай кашкі наварыла. Ешце,
покуль не астыла.

*Алесь Бадак*

# Ё



**Ёлачны — ёлочный** (об украшении).

**Ёлка — ёлка** (новогодняя).

Прыгажуні, папялушкі, Новы год наблізяць стрэлкі —
Лесу вечныя дачушкі. Хочуць ёлкамі стаць... *(елкі).*

*Уладзімір Мазго*

**Ёсць — имеется, есть.**





www.kamunikat.org

# Ж



**Жаба — 1) жаба; 2) лягушка.**

На купіне жаба прысела.
Заснула на сонейку смела.
— Жабуцька, ты спі адным вокам —
Буслы тут зусім недалёка.

*Ніна Галіноўская*

**Жабраваць — просить подаяние, нищенствовать, побираться.**

♦ Хто з маладосці не працуе, той на старасці жабруе.

**Жаданы — желанный.**

**Жадаць — желать, хотеть.**

♦ Не гняві Бога, не жадай чужога. (На чужой каравай рот не разевай.)

**Жарт — шутка.**

Гэта жарт чый ці гульня:
Лета, сонца, а ў паўнеба —
Беласнежная лыжня? *(След ад самалёта)*

*Уладзімір Паўлаў*



**Жартаваць — 1) шутить; 2) играть.**

Калі я з катом жартую —
Ганарысты дог лютуе,
Калі я гуляю з догам,
Кот ўцякае на дарогу.
*Алесь Пісьмянкоў*



www.kamunikat.org

# Ж

**Жаўруковы, жаваронкавы — жавороночий.**

**Жах — страх, ўжас.**



У яе чатыры лапкі
І на кожнай кіпці-драпкі.
Ноччу вочкі гэтак ззяюць —
Жах на мышак наганяюць. *(Кошка)*
*Уладзімір Мацвеенка*

**Жвавы — резвый, проворный, шустрый.**

У акенца тук-тук-тук —
Просяць семачак і круп
Жвавыя сінічкі,
Ростам невялічкі.
*Ніна Галіноўская*



**Жвір — гравий.**

= Буйназярністы жоўты пясок

**Жмёня — горсть.**

Жыта налілося.
Кажа Сеньку тата:
— Палічы, ці многа
У каласку зярнятак.
Ён яшчэ маленькі,
Ды знайшоўся Сенька:
— Во, зярнятак многа —
Поўненькая жменька!
*Мікола Маляўка*

**Жмуркі — прятки.**

Днём і ноччу куркі
Гуляюць у жмуркі.
Нават певень аслеп —
Бо зацвіў курасьлеп.
*Васіль Зуёнак*



**Жнівень — август.**

♦ Хто ў жніўні гуляе, той узімку галадае.

www.kamunikat.org

**Жніво — жатва.**

**Жораў, жуpавель — жуpавль.**



Збіраў жораў журавіны
Ля імшарнай* баравіны.
Журавіны чыстыя, спелыя, расістыя.
Травы тут пахучыя, я гады гаючыя.
*Пятро Сушко*

* Імшарны — болотный.

**Жорны — ручная мельница.**

**Жорсткі — 1) жестокий, жестокосердный; 2) жёсткий.**

І кветкі пахінулі Калі пазналі-ўчулі
Да Лілі ўсе пялёсткі, Пра лёс дзяўчыны жорсткі.

*Уладзімір Дубоўка*

**Жуда, жудасць — ўжас; жуть.**

Каб нагнаць на ўсіх жуды Ён іграе без дуды,
І каб доўга помнілі, Завывае ў коміне. *(Вецер)*

*Уладзімір Паўлаў*

**Журавіны — клюква.**

На балоце жураўліным
Мы шукаем журавіны.
Журавіны мы збіраем —
Вам, сябры, таксама раім,
Абаронай стаць павінны Ад
хваробаў журавіны.

*Уладзімір Мазго*



**Журботна — грустно.**

**Журыцца — печалиться, грустить.**

Неўзабаве да дна [гусі]
Спаражнілі* карытца.
Ну, цяпер да відна Могуць
спаць, не журыцца. *Уладзімір Дубоўка*

* Спаражнщь — опорожнить.

# Ж

**Жывёла** — **животное.**

Рашыў Вясёлкін Вася: Сам адкрываю школу. Збіраю ў першым класе

І птушак, і жывёлу — Усіх звяроў на свеце. І вы прыходзьце, дзеці.

*Васіль Вітка*

**Жырафа** ж. — **жираф** м.

**Жыта** — **рожь.**



— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.
— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.

*Міхась Гелер*

**Жыхар** — **житель, обитатель.**



Спіць зімою да вясны
Соладка жыхар лясны.
Сніць не снег ён і не лёд,
А духмяны смачны мёд. *(Мядзведзь)*

*Міхась Пазнякоў*

**Жыццё** — **жизнь.**

Дружыце! — і будзе прыгожае,
Харошае ваша жыццё.

*Анатоль Вярцінскі*

**Жэўжык** — **озорник, шалунишка, баловник.**

У мяне ёсць жвавы шэранькі каток,
Жэўжык, непаседа, вечна — скок ды скок!
Вечна абяцае слухацца каток,
А пасля ў бабулі схопіць з рук клубок.

*Алесь Жаўрук*



www.kamunikat.org

# З

**Забава — забава, развлечение, потеха.**

Перш я кніжку дачытаю,
А затым рашу задачу.
А пасля галоўных спраў
Час настане для забаў.

*Міхась Пазнякоў*



**Забараніць — запретить.**

Маці ўсім забараняла
Рваць зялёныя ранеты.

*Максім Танк*

**Забаўка — игрушка.**

Ён здалёку вам прынёс
Цацак-забавак багата.
А яшчэ прынёс здалёк
Ён прысмакаў самых розных,
Бо багаты кашалёк
Мае гэты дзед марозны.

*Кастусь Жук*



**Завадатар — заводила.**

**Завея — метель, вьюга, пурга.**

Люблю я зіму з маразамі,
Завеі белыя ў палях,
І снегу скрып пад палазамі,
І ціш зімовую ў лясах.

*Якуб Колас*

**Завіруха — тое, што завея.**

Завіруха завяла
Песеньку зімовую.
Скрозь узгоркі замяла
Белаю абноваю.

*Артур Вольскі*



**Завітаць — зайти; навестить.**

Дзве цікаўныя сняжынкі
Завіталі да Марынкі.
На каўнерык ёй прыселі,
Спадабацца ёй хацелі.

*Алесь Бадак*

**Завіхацца — хлопотать.**

**Завулак — переулок.**

**Завушніца — серьга, серёжка.**



**Загад — приказ.**

**Загадаць — приказать.**

Тата з мамай загадаў і
Не катацца мне на хвалі:
— Хваля змые... Хваля зваліць...

*Алесь Пісьмянкоў*

**Загадка — загадка.**

= Кароткае апісанне нейкага прадмета, з'явы, якую трэба пазнаць.

Нам Пятрок спачатку
Загадаў загадку:
— Мой кравец заўсёды колкі,
Бо на ім тырчаць іголкі.

*Сяргей Грахоўскі*



**Загаловак — заглавие.**

**Задавальненне — удовольствие.**

Вам дару з задавальненнем
Песеньку "З днём нараджэння".
Пець яе буду нязменна...
*(Кракадзіл знаёмы Гена).*
*Ні на Галіноўская*



**Зазначыць — сказать; заметить, отметить.**

**Зайздрасць — зависть.**

**Займаць — занимать.**

**Закалыхаць — убаюкать, укачать.**

Прыйшла — і цёмна стала,
Дзяцей закалыхала,
Сама заснула ўранку,
Схаваўшыся ў альтанку. *(Ноч)*

*Мікола Маляўка*

**Закрасаваць — расцвести, зацвести.**

Кідае сонца кветкі з неба,
Яны лятуць на нашу глебу.
У нашых пушчах, на ўзгорках
Закрасавалі кветкі-зоркі.

*Уладзімір Дубоўка*



**Залетась — в позапрошлом году.**

**Замацаваць — закрепить.**

**Занадта — слишком, чересчур.**

Адказ ад птушак быў такі:
— Занадта шлях для нас цяжкі!
Не паляцім далека так!

*Уладзімір Дубоўка*

www.kamunikat.org

# З

**Занядужаць — занемочь, заболеть.**

**Занятак — занятие, дело.**

У малога Міхаська То малюе ён звярка,
Ёсць заўжды занятак: То жука, то хату.

*Кастусь Жук*

**Запавет — завет; завещание.**

**Запалка — спичка.**

Запалка малая, ды бяда ад яе можа быць вялікая.

**Запамятаваць — забыть.**

**Запамятаць — запомнить.**

**Заплюшчыць — закрыть** (глаза).

А не спаў жа ён уночы Хутка ён заплюшчыў вочы,
Ні адной амаль хвіліны. На абрус схіліў чупрыну.

*Уладзімір Дубоўка*

**Запрашаць — приглашать.**

І стол тым часам накрываюць,
Гасцей шумлівых запрашаюць.

*Якуб Колас*

**Запытацца — спросить.**

Запыталася Аленка
У вясёлкі залатой:
— Хто табе купіў сукенку?
У мяне няма такой!
— З чыстых промняў, нібы з нітак,
Клапатліваю рукой
Летні дождджык яе выткаў
З ясным сонцам раніцой.

*Яўген Крупенька*



**Запэцкаць — вымазать, выпачкать.**

— Чорны, брудны парсючок,
Дзе запэцкаў ты бачок?
— Спрытна мераў лужыны,
Брудныя калюжыны.

*Таццяна Мушынская*



**Зарабляць — зарабатывать.**

Навучуся я чытаць, навучуся я пісаць —
І заўжды адны "дзесяткі" буду зарабляць.

*Алесь Бадак*

**Зараз — сейчас, теперь.**

Ціха, дзеці, калі ласка,
Раскажу вам зараз казку.

*Уладзімір Дубоўка*

**Зараснік — заросль; кустарник.**

**Засведчыць — засвидетельствовать.**

**Заскавытаць — заскулить.**

Тыгр не сніў ва сне ніколі,
Каб яго хлапчук адолеў.
Ён завыў, заскавытаў тут,
Нарабіў такога гвалту,
Што да хмар л я цел а рэха.

*Уладзімір Дубоўка*



**Засмучаць — огорчать.**

**Засынаць — засыпать.**

Сон схаваўся пад падушкай,
Казкі шэпча мне на вушка.

Засынаюць ціха зоркі Разам з
хлопчыкам Ягоркам.

*Таццяна Мушынская*



www.kamunikat.org

**Затока — заводь, затон. Затрымацца — задержаться. Затым — потом; затем. Заўвага — замечание.**

**Заўважыць — заметить.**

Мышка з норкі нюх-нюх-нюх, Да гарошынкі трух-трух.



Толькі ўзяць хацела ў рот, Як яе заўважыў кот.

*Уладзімір Дубоўка*

**Заўжды — всегда.**

Мы любім "Калыханку" І кожны-кожны дзень

Гатовы хоць да ранку Заўжды яе глядзець.

*Хведар Гурыновіч*

**Заўзяты — завзятый; усердный.**

**Заўсёды —** тое, што **заўжды.**



Яны ўсюды з нам і ходзяць,
І заўсёды — у ахвоту.
Весяляцца ў карагодзе
І маркоцяцца ў хлюпоту. *(Чаравікі)*

*Іван Муравейка*

**Заўчора — позавчера.**

**Захад — 1) запад; 2) закат.**

**Захапляцца — восхищаться, любоваться.**

Хвост трымае ён трубой, У паходах, у турботах,
Захапляецца сабой. Ваш знаёмы... *(Кот у ботах).*

*Ні на Галіноўская*

**Захворванне — заболевание.**



www.kamunikat.org

# З

**Зашмат — слишком много.**



Той, хто якае зашмат,
Ставіць сам сябе назад.
*Рыгор Барадулін*

**Захаваць — сохранить; спрятать.**

**Зашпіліць — застегнуть.**

**Зацірка — затирка.**

= Страва з дробных мучных камячкоў, згатаваных на вадзе або малацэ.

**Зацята — упорно; настойчиво.**

**Збан — кувшин, жбан, крйнка.**

Ціха чэрпалі званочкі
Сінь крыніцы ў збаночкі.
А гарлачыкі да змроку
Мылі твар свой у затоках.

*Кастусь Цвірка*

**Збірацца — собираться.**

Як збіраюся я ў школу,
У мяне настрой вясёлы.
Толькі лялькі плачуць горка:
"Хто нас пакатае з горкі?"
*Таццяна Мушынская*

**Збіраць — собирать.**



Пчолкі з кветак мёд збіраюць —
Кветкі болей расцвітаюць.
*Кастусь Цвірка*

**Збожжа — зерно, хлеб.**

Гаспадар руплівы зможа
У засек* засыпаць збожжа.
*Рыгор Барадулін*

* Засек — закром.



www.kamunikat.org

# З

**Званочак — колокольчик.**

Пасля кароткай ночкі Ліловыя званочкі
Прыйшоў вясёлы дзень. Пазвоньваюць: дзінь-дзень.

*Хведар Гурыновіч*



**Звонку — 1) снаружи; 2) внешне.**

**Звычайны — обычный.**

**Звычка — 1) привычка; 2) навык.**

**Звярнуцца — обратиться.**

**Згадзіцца — согласиться.**

**Згарнуць — 1) сгрести; 2) свернуть, сложить.**

**Згаснуць — угаснуть, погаснуть**

**Згатаваць — приготовить.**



Выспеў каля хаты нізкі і вусаты.
Як сажнём, наробім круп,
То згатуем смачны суп. *(Ячмень)*
*Міхась Пазнякоў*

**Згода — согласие, мир.**

У гэтай знаёмай хаціне,
Хоць ёсць і цяпло і згода,
Чатыры браты разам жывуць,
А пяты асобна заўсёды. *(Рукавіца)*
*Казімір Камейша*



**Зграбны — стройный, изящный.**

**Зграя — свора.**

**Згубіць — потерять.**
♦ Лепш з разумным згубіць, чым з дурным знайсці.



www.kamunikat.org

**Здабываць — добываць.**

**Здабытак — 1) достояние; 2) приобретение.**

**Здавацца — казаться.**

**Здаволены — довольный; удовлетворённый.**

**Здагадацца — догадаться.**

**Здалёк — издали.**

**Здарэнне — случай, происшествие.**

**Здатны** *(да чаго)* — **способный** *(к чему).*

Яна ў бары жыве ў нары.
Яркая рыжуха —
Здатная хітруха. *(Ліса)*
*Міхась Пазнякоў*



**Здзівіцца — удивиться.**

Аж супыніла ход свой Сонца.
Яно здзівілася бясконца.
*Уладзімір Дубоўка*

**Здольны** — тое, што **здатны.**

Жыў даўней адзін хлапчына
З васільковымі вачыма.
Сам высокі, спрытны, стройны,
Да работы ўсякай здольны.
*Уладзімір Дубоўка*



**Зеляніна — зёлень.**

**Зерне — зерно.**

Не ралля, а пух узняты!
Хутка ў ім растуць зярняты.
*Уладзімір Дубоўка*

www.kamunikat.org

**Зёлкі — лекарственные растения.**

Козлік Беня ранкам зёлкі Каб зімой заміж* таблетак Сабіраў ля рэчкі зёлкі, Піць гарбату з траў і кветак.

*Леанід Пранчак*

* Заміж — вместа.



**Ззаду — сзади.**

♦ Бойся быка спераду, каня ззаду, а дурня з усіх бакоў.

**Ззянне — сияние.**

**Зірнуць — посмотреть, взглянуть.**

**Зіхацёць, зіхцець — сиять, сверкать.**

**Злавіць — поймать.**

**Злічыць — сосчитать.**

**Зломак — ломаная вещь.**

**Злосны — злой; злобный; сердитый.**

**Злучаць — соединять.**

**Змалку — сызмала, с малых лет.**

З татам крочым на рыбалку, Вуды, блешня і чарвяк...
Я люблю рыбалку змалку. Ты плыві да нас, шчупак!

*Тацяна Мушынская*



**Змарыцца — устать.**

**Змрок — 1) сумрак; 2) сумерки.**

**Знаёміцца — знакомиться.**

**Знаёмы — знакомый.**

**Знарок — нарочно; умышленно.**



www.kamunikat.org

# З

**Знаходзіцца — находиться.**

**Знаходка — находка.**

Застаецца толькі сесці
І знаходку тую [каўбасу] з'есці.
*Уладзімір Дубоўка*



**Значны — значительный.**

**Знікаць — исчезать.**

Ідзе сястра да брата,
А брат знікае з хаты. *(Сонца і Месяц)*
*Міхась Пазнякоў*

**Знікнуць — исчезнуть.**

Зніклі завірухі,
К нам вясна прыйшла.
*Янка Журба*



**Знічка — падающая звезда.**

Стаіць, выглядаючы з жыта, Што ўпала іскрыні
Як зорачка-знічка здалёк, Палеткаў краса — васілек.
*Авяр'ян Дзеружынскі*

**Зноў — снова, опять.**

**Знянацку, знячэўку — врасплох, внезапно.**

Воўк знячэўку аж сеў,
Потым скочыў на ногі —
І не бег, а ляцеў Без
ніякай дарогі.
*Уладзімір Дубоўка*



**Золак — заря, рассвет.**

**Золка — сыро, холодно.**

**Золь — сырость, слякоть.**



www.kamunikat.org

# З

**Зорка — звезда.**

Калі стваралісь Богам светы,
Па зорцы светлай чалавеку
Назначыў Бог святы спрадвеку.

*Якуб Колас*



**Зразумела — понятно.**

**Зразумець — понять.**

Касалапы Мішка зачытаўся кніжкай.
Ды не можа зразумёць —
Розняцца чым "медзь" і "мець",
"Лес" і "лез", "каўбой" - "канвой"

Проста гора Мішку.
Хай загляне
ў слоўнік свой Міш ка-
карантышка. *Кастусь Жук*

**Зрок** м.— **зрение** ср.

**Зручны — удобный; ловкий.**

**Зрэнка — зеница, зрачок.**

**Зусім — совсем.**

**Зух — лихач, ухарь.**

**Зухавата — молодцевато, лихо.**

**Зыркі — яркий.**

**Зычыць — желать.**




♦ Не зыч ліха другому, каб не давялося самому.

**З'ява — явление.**

**Зязюля — кукушка.**

Пасля дажджу кувае
Зязюля нам з табой
І радасна ківае
Званочак галавой.

*Хведар Гурыновіч*



www.kamunikat.org

# I



**Іκласты — клыкастый.**

**Ікол,** *мн.* **іклы — клык.**

**Ілюстрацыя — иллюстрация.**

= Малюнак у кнізе або часопісе, які дапамагае зразумець змест.

**Імгненне — мгновение.**

**Імклівы — стремительный.**



Адзін уцякае, другі — даганяе.
Ніводзін ніколі спачыну не знае.
За бегам імклівым сачыць паспявай...
*(Героі з мультфільма "Ну, пачакай!").*

*Ніна Галіноўская*



**Імкнуцца — стермиться.**

**Імшара — моховое болото.**

**Інакш, іначай — иначе; по-иному.**

**Індык — индюк.**

**Іншы - иной, другой,**

**іржышча, ржышча — жнивьё.**

**Існаваць — существовать.**

**Істота — существо.**

**Істужка** — тое, што **стужка.**

www.kamunikat.org

# К



**Каб — чтобы, чтоб; если бы.**

**Кава ж. — кофе** м.

**Кавалак — кусок.**

♦ Без кавалка хлеба кепская бяседа.



**Кавадла — наковальня.**

**Каваль — кузнец.**

У кузні працаваў заядла
Каваль — кувалдай біў кавадла.

*Рыгор Барадулін*

**Кавўн — арбуз.**

Круглы ён і паласаты,
Брат прынёс яго дахаты.
Вельмі смачны, сакавіты,
Яркай чырванню наліты.

*Уладзімір Мацвеенка*



**Кажан — летучая мышь.**

Ціш лясная ў гушчары:
Спяць і птушкі, і звяры.
Кажану ж, наадварот,
Ноччу хочацца ў палёт.
Чуе ў цемры кожны гук,
Не напорацца на сук.

*Віктар Гардзей*





www.kamunikat.org

**Кажух — овчинный полушубок.**

**Казаць — говорить.**

На сасне не для рэкламы
Адбівае тэлеграму:
"Лес — вялікае багацце!"
Кажуць дрэвы: — Дзякуй, дзяцел!
*Уладзімір Мазго*

**Казка — сказка.**




У казках ігрушы растуць на вярбе,
Грамаце вучыць варона сароку.
Гавораць, знайшоўся адзін верабей,
Што возера выпіў у спёку.
*Васіль Вітка*

**Казюрка — козявка, букашка.**

У казюрак баль ідзе —
З малаком п'юць чай:
Каля тыну* на градзе
Вырас малачай.
*Васіль Зуёнак*

* Тын — агароджа з жэрдак, перапле ценых лазой.

**Калі ласка — пожалуйста.**

Вы пыталіся пра казку?
Вось вам казка, калі ласка!
*Уладзімір Дубоўка*

**Калісьці, колісь — когда-то, прежде.**

Калісьцы Сонца ў небе сінім
Хадзіла з Месяцам, як з сынам.
Тады не зналі людзі змроку.
*Уладзімір Дубоўка*



www.kamunikat.org

**Калматы — лохматый.**

**Калодзеж, калодзезь — колодец.**

У хаце дзверы зарыпелі,
Скрыпяць калодзежы, вароты,
Пайшла разгульвацца работа.
*Якуб Колас*



**Калюжына — тое, што лўжына.**

**Калыска — колыбель.**

Калыхала маці сына
У калысцы ліповай.
*Янка Купала*

**Калыханка — колыбельная песня.**

**Каля, ля — возле, у, при; около.**

Між азёр пратока,
Над пратокай — кладка,
Каля кладкі збоку
Ёсць баброва хатка.
Плаваюць ля хаткі
Шустра бабраняткі.
*Пятро Сушко*

**Каляровы — цветной.**

Падарылі суседзі
Тэлевізар мядзведзю,
Не абы-які — новы,
Ды яшчэ каляровы.
Акуляры надзеў
Імяніннік мядзведзь.
І не есць, і не спіць —
Тэлевізар глядзіць.
*Мікола Маляўка*



**Камізэлька — жилетка, жилет.**



www.kamunikat.org

# К

**Канапа — диван.**

Па дыване пахадзі, а на канапе пасядзі.

**Канюшына — клевер.**

Пчолка шэпча з канюшынай:
— Даць нектару мне павінна.
*Ніна Галіноўская*



**Капёж** м. **— капель** ж.

**Каптан — кафтан.**

Чый каптанік у гарошкі,
Есць і крыльцы, ёсць і ножкі,
І прыгожая галоўка?
Гэта... *(божая кароўка).*
*Ніна Галіноўская*

**Капялюш,** *мн.* **капелюшы — шляпа.**

**Кара — наказание.**

**Карагод — хоровод.**

Водзіць з нам і карагод
Сам Мароз-дзядуля.
Многа казак у яго І
вясёлых гульняў.
*Мікола Чарняўскі*

**Каралі — бусы.**

Крышталёвыя каралі
Ранкам на траве ляжалі.
Я сабраць хацела ўдзень, Глянула —
няма нідзе. *(Раса) Уладзімір*
*Мацвеенка*

**Карысна — полезно.**

А салат з марской капусты
Апетытны і не тлусты.
Да таго ж сказаць не лішне:
Ужываць яго карысна!
*Іеанід Пранчак*





www.kamunikat.org

# К

**Карыстацца — пользоваться.**



**Касач — ирис.**

Вострыя ўзнялі мячы
Каля рэчкі касачы.
*Васіль Зуёнак*

**Кастрычнік — октябрь.**

♦ Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць.

**Касцёл — костёл.**

= Каталіцкі храм.

За тых, хто ў магіле цёмнай,
За тых, хто яшчэ жыве,
Памолімся ціха ў касцёле,
Памолімся ціха ў царкве.
*Мікола Маляўка*



**Каўнер — воротник.**

**Качар — селезень.**

**Качка — утка.**

За качкай ходзяць качаняты,
А за гускай — гусяняты,
За караваю — бычок,
А за свінкай — парсючок.
*Ніна Галіноўская*

**Кашлаты — мохнатый; лохматый, косматый.**

**Каштоўны — ценный; драгоценный.**

**Кашуля — рубашка; сорочка.**

**Квактуха, квахтуха — курица-наседка.**

**Кватэра — квартира.**

www.kamunikat.org

# К



**Кветка — цветок.**

Выйдзі ў луг ці ў поле летам —
Колькі там дзівосных кветак!
Жоўтыя, ліловыя, белыя, ружовыя...
Сінія, як вочкі, васілёчкі і званочкі.
*Кастусь Цвірка*

**Квітнець — цвести.**

**Квяцісты — 1) цветистый** (луг); **2) цветастый** (платок).

**Кемлівы — сообразительный.**

**Кепскі — плохой.**

**Кілім — ковёр.**

**Кінуць — бросить.**
Кінь з блыху, а вырасце з кулак. *(Бурак)*

**Кіпень — кіпяток.**

**Кіпцюр, капцюр — коготь.**

**Кірунак — направление.**

**Кішэнь, кішэня** ж. **— карман**
м.



У мяне рука ў кішэні:
Там арэхаў ёсць дзве жмені.
(З дзедам назбіраў улетку.)
Я на снежную сурвэтку
Два арэхі палажыў.
— Гэй, вавёрачка, бяжы!
Апусціўся ўніз звярок,
Хап арэх — і на сучок.
*Ніна Галіноўская*

www.kamunikat.org

# К

**Клікаць — звать.**



Кліч не кліч: маўчыць зацята,
Як пяску набраў у рот:
Няма калі* — будуе хату
Пад зямлёю чорны крот.

*Васіль Зуёнак*

* Няма калі — некогда.

**Клопат — забота.**



А яшчэ за клопат пільны
Дзякуй сталярам:
Шмат дзвярэй яны зрабілі,
Шмат аконных рам.

*Мікола Маляўка*

**Клубніцы — клубника.**

**Кмен, кмін — тмин.**

**Кнігарня — книжный магазин.**

**Кнігаўка — чибис, пигалица.**

Не чытала, не пісала,
Ну ні "а", ні "б" не знала,
Хоць пра кнігу з выгукам*
Дзень крычала кнігаўка.

*Васіль Зуёнак*

* Выгук — восклицание; выкрик, вскрик.

**Кожны — каждый.**



Чаго ходзяць у бальніцы?
Кожны ведае — лячыцца.
Там ёсць многа дактароў.
І так лечаць — будзь здароў!

*Васіль Вітка*



www.kamunikat.org

# К

**Кола — 1) колесо; 2) круг.**



Самакат у Дзімы новы
Са званочкам адмысловым.
Руль бліскучы, колаў — тры.
Рад і Дзіма, і сябры.
— Ты нас крышку павазіў бы...
— Гэй, сябры, сюды гайда!
Мне машыны не шкада.

*Хведар Гурыновіч*

**Колер — цвет.**

Колерам белым зіма варажыла,
Чорнымі толькі пакінула дрэвы,
Яркую чырвань пакінула сонцу,
Сінюю фарбу пакінула небу.

*Таццяна Мушынская*

**Комін — труба** (дымовая); **дымоход**

**Конаўка — кружка** (металлическая).

**Конік — кузнечик.**

Хлопчык коніка злавіў
У траве на ўзлессі.
Дома ў шклянку пасадзіў:
— Ну, спявай мне песні!
— Сумна мне тут без сяброў
Аднаму ў палоне.
Адпусці мяне дамоў —
У прастор зялёны.

*Ніл Гілевіч*



**Копанка — тое, што сажалка.**

**Корак** м. **— пробка** ж.

# К

**Коўдра — одеяло.**

Чорная кошка шкрабецца ў акно.
Дзеткі, пад коўдру пара вам даўно. *(Ноч)*

*Іван Муравейка*

**Кошык — корзина.**

**Кпіць** *(з каго, з чаго)* **— насмехаться** *(над кем, над чем)*, **зло шутить.**

**Кравец — портной.**

**Краіна — страна.**



Жывём мы ў мірнай краіне.
Яе Беларуссю завуць.
Пад небам праменістым, сінім
Гасцінныя людзі жывуць.
*Ні на Галіноўская*

**Край — страна; местность, которая выделяе какой-то особенностью.**

Блакіт азёр, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.
Мой край завецца Беларуссю,
І сам я — хлопчык-беларус.

*Сяргей Сокалаў-Воюш*



**Крама — магазин.**

Раніцой сказала мама:
— Збегай, Танечка, у краму.
Купіш мыла і вяртайся,
Ды нідзе не затрымайся.

*Іван Муравейка*



www.kamunikat.org



**Крамяны — упругий, крепкий.**

Паклікала маці дачушку Ірынку.
Разрэзала яблык на дзве палавінкі.
А быў ён салодкі, ружовы, крамяны.
І з'ела дзяўчынка той яблык духмяны.

*Юрась Свірка*

**Кранаць — трогать.**

**Крапіва — крапива.**

Цётка ёсць яшчэ такая, Я кую ў горад не пускаюць. Яна на ўскраіне жыве, Ёй толькі шкода ў галаве.

З закрытымі вачыма Яе пазнаць магчыма. Гэта злосная трава І завецца... *(крапіва).*

*Рыгор Барадулін*

**Красавік — апрель.**

♦ У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе — тады ніхто не збяднее.

**Краска — цветок.**

Эх, скошан луг — і зніклі краскі,
Бы тыя чары мілай казкі.

*Якуб Колас*

**Красуня — тое, што прыгажуня.**

Ездзіў ранкам дзед Рыгор
Па яе за цёмны бор.
А цяпер красуня ў зале,
Яе дзеці прыбіралі.
І назаўтра без турбот
З ёй сустрэнуць Новы год. *(Ёлка)*

*Уладзімір Мацвеенка*



**Кратаць — трогать.**



Камарык-камар,
Не кратай мой твар.
Сяброў сваіх забяры —
Пакружыцеся ўгары.

*Ніна Галіноўская*

**Крок — шаг.**

Кожны ўрок — да ведаў крок.
Ты вучы, вучы, дзіцятка,
Скуль* бярэцца куранятка,
Скуль жыцця ідзе выток.

*Кастусь Жук*

* Скуль — откуда.

**Кроп — укроп.**

**Кропля — капля.**

**Кросны — ткацкий станок.**

**Крочыць — шагать.**



На падворку каля хаты
Дуб страсае жалуды.
Крочаць дружна парасяты
Разам з мамаю туды.

*Кастусь Жук*

**Крупнік, крупеня — крупяной суп.**

**Крыга — льдина.**

**Крылца, крыльца — крылышко.**

**Крыніца — родник, источник.**

www.kamunikat.org

# К

**Крыўда — обіда.**

І не Маша, і не Галя,
А дзяўчынка ў крыўдзе —
За касу яе цягае
Кожны, хто ні прыйдзе.
Жыве ў спакоі вельмі рэдка,
А завецца я на... *(рэпка).*

*Рыгор Барадулін*

**Крыўдаваць, крыўдзіцца** **обижаться.**



**Крыўдзіць — обижать.**

**Крыўдлівы — обидчивый.**

**Крыху, крышку — немного.**

**Крэйда — мел.**

**Кубак — кружка, чашка.**

**Кувалда — тяжёлый молот.**

**Кудысьці — куда-то.**

**Кузня — кузня, кузница.**

**Кульнуцца — кувыркнуться, перевернуться.**

**Купіна — кочка.**

**Курасьлёп — лютик едкий; курослеп; куриная слепота.**

**Кут — угол.**

**Куток — уголок.**



**Куфар — сундук.**

**Куфэрак — 1) сундучок; 2) ларчик.**

**Кухар — повар.**

www.kamunikat.org

# Л

**Лава**[1] — **скамейка, скамья.**

♦ Дзе сыноў лава — там бацьку слава, дзе дачок лава там матцы слава.

**Лава**[2] — **лава.**

= Вулканічная маса.

**Лагодны** — **добродушный, незлобивый.**

**Лагчына** — **низина, ложбина.**

**Ладзіць** — **строить; обустраивать; устраивать.**

З вясновым цяплом
З поўдня вярнуўся
І ладзіць на дрэве жытло
Даўгадзюбы... *(бусел).*
*Міхась Пазнякоў*



**Ладны** — **1) значительный;**

**2) статный, ладный** (о фигуре).

**Лазня** — **баня.**

Сёння лазня ў дуброве.
Ладзіць лазню дождж вясновы.
Мые травы і сцяжыны,
Мые лісце на галінах.
*Казімір Камейша*





www.kamunikat.org

**Лайдак — бездельник.**

Цэлы дзень і цэлы вечар
Яката вучыў на печы.
Ні чытання, ні пісьма
Мой не вывучыў Кузьма.
Ці то я вучыў не так,
Ці то ён такі лайдак?

*Алесь Пісьмянкоў*



**Ланцуг — цепь.**

Весяліцца не магу,
Калі ты на ланцугу,
Бо ні кол і друга друг
Не навяжа на ланцуг.

*Алесь Пісьмянкоў*

**Ластаўка — ласточка.**

— Ластаўка, куды ты?
— На млынок.
Намялю там жыта
І спяку блінок.
Дзетак-малалетак накармлю.
Добра летам, добра летам,
Лета я люблю!

*Аляксей Пысін*



**Ласун — лакомка, сладкоежка.**

**Ласунак — лакомство.**

Горад бачыў я цудоўны
У далёкай старане,
Горад быў ласункаў поўны,
Ён запамятаўся мне.

З цукру там былі дарогі,
Ледзянцовыя маеты,
Шакаладныя стаялі Кветкі,
дрэвы і кусты.

*Васіль Жуковіч*

www.kamunikat.org

# Л

**Лашчыць — ласкать.**

**Ледзь — еле, чуть, едва.**



А вось тэта — махавік,
Ён пад мохам ледзь не знік.
Маладыя масляікі
Паўцякалі ў сасняікі.

*Уладзімір Мазго*

**Лекі — лекарства.**

**Ленавацца — лениться.**

**Лепей, лепш — лучше.**

Я — беларус маленькі Хачу і я, каб лепей
З блакітнымі вачыма. Жыла мая Радзіма.

*Мікола Маляўка*

**Лесавік, лясун — лёший, лесовик.**

**Лесвіца — лестница.**

**Летась — в прошлом году.**

**Летнік — летний лагерь.**
= Дзіцячы лагер, месца адпачынку і аздараўлення дзяцей летам.

**Лес — судьба.**
Як паткнецца* мышка з норкі,
Лес пазнае самы горкі:
Кот адразу ашчаперыць**,
А пасля пачне... вячэраць.
*Уладзімір Дубоўка*



* Паткнуцца — высунуться.
** Ашчаперыць — обхватить.



www.kamunikat.org

# Л

**Лік — число, счёт.**

**Ліпень — июль.**

**Лістапад — ноябрь.**

♦ Прыйшоў лістапад — кармі скацінку, брат




**Лісце — листва.**
**Літара — буква.**

"Мама", "тата", "школа", "крама",
"Глеба", "праца", "запавет"...
Знайце, дзеткі дарагія,
Літары хоць і малыя,
Ды адкрыюць вам сусвет.

*Уладзімір Мацвеенка*

**Ліха — несчастье, зло, беда, горе.**

Ой, сыночак, мая зорка!
Як цябе падгадаваць,
Як ад ліха захаваць?

*Якуб Колас*



**Ліхтар — фонарь.**

Чые ноччу ў гушчары
Зіхацяць два ліхтары,
Хто ўсю ноч гагоча,
Спачываць не хоча, Хто,
пабачыўшы святло, Хутчэй лезе ў
дупло? *(Сава) Васіль Вітка*

**Лічба — цифра.**

**Лічыць — считать.**

Буду ў школе я чытаць, І
лічыць, і маляваць.
І як толькі падвучыся, Дык
настаўніцай зраблюся! *Таццяна
Мушынская*



www.kamunikat.org

**Лічэнне — счёт.**

Знайце: нават і нулі Пры
лічэнні — каралі! Калі нуль
пры лічбе стане,

Лічба мігам ўзрастае Аж у
дзесяць у разоў, — Вось вам
выхадзец з нізоў!

*Васіль Зуёнак*




**Ложак — кровать.**

Ну і хітры наш Алёшка —
Не паднімеш яго з ложка.
Сніць ён сны ў гасцях у дзеда.
Кожны ранак бачыць новы —
Двухсерыйны, каляровы.

*Алесь Пісьмянкоў*

**Лужына — лужа.**

**Лунаць — 1) реять, парить (в** воздухе); **2) витать.**

**Луста, лустачка — ломтик** (хлеба).

**Лыжка — ложка.**

Жалезнай лыжкай волат
Свой наталяе голад:
Пясок і гліну нашу
Ён чэрпае, як кашу. *(Экскаватар)*
*Мікола Маляўка*



**Любы — любимый.**

**Любы — любой.**

**Люляць — качать, баюкать.**

**Люстэрка — зеркало.**

Запэцкаў нос сабе Валерка.
А вінаваты хто? Люстэрка!

Яно, свавольнае, пакажа: На
носе ў Валеркі сажа.

*Мікола Мятліцкі*

www.kamunikat.org

**Лютаваць — лютовать; зверствовать.**

**Люты[1] — злой, жестокий; зверский.**

**Люты[2] — февраль.**

Зухавата месяц люты
Ходзіць, добра апрануты.
Снег іскрыцца ў прасторах.
Лёд трашчыць на ўсіх азёрах.

*Анатоль Грачанікаў*



**Ля** — тое, што **каля.**

Нам яна даўно знаёма,
Ёсць і ў лесе, і ля дома.
У спякотны дзень якраз
У цянёк схавае нас. *(Крона)*

*Міхась Пазнякоў*

**Лядзяк, лядзяш — льдинка, сосулька.**

Смачныя, што ні кажы,
Пад страхою ледзяшы.
Так і просяцца ў рот
Акурат пад Новы год.
Толькі лепш іх не смакчы —
Могуць горла апячы.

*Кастусь Жук*

**Лялька — кукла.**

Як маленькую сяброўку
Ляльку любіць Каця.
То расчэша ёй галоўку,
То памые плацце.

*Андрэй Александров'^*



**Лямантаваць — вопить, кричать.**

**Лянота — лень.**

**Ляшчына — орешник, лещина.**



www.kamunikat.org

# М

**Мабыць — пожалуй, вероятно.**

**Магутны — 1) мощный; 2) могучий, сильный.**

**Магчы — мочь.**

**Магчыма — возможно, наверно, пожалуй, может быть.**

Мяне ты сустракаў, магчыма,
У памяшканні між дзвярыма
Або ў вагоне пасажырскім,
Калі імчаў у шлях няблізкі. *(Тамбур)*
*Міхась Пазнякоў*

**Майстар, майстра — мастер.**

**Майстраваць — мастерить.**

Разам з лепшым сябрам Санькам
Змея мы майструем зранку.
Дзень майструем. Ён гатовы —
Лёгкі, зграбны, адмысловы.
*Таццяна Мушынская*



**Майстрыха — мастерица.**

**Маладзік — молодой, растущий месяц.**

**Маладосць — молодость.**

**Малайчына — молодец.**

# М

**Маланка — молния.**



Гром. Маланка. Лівень.
Гул вады.
Уцякаюць людзі
Хто куды.

*Аляксей Пысін*

**Малачай — молочай.**

**Малеча — 1) маленькие дети, живые существа;**
**2) ребёнок.**

Чаму не спіць малеча?
Чаму з калыскі цягне ручанняткі*?

*Сяргей Дзяргай*

* Ручаняткі — ручонки.

**Малюнак — рисунок.**

**Маляваць — рисовать.**

Габрынька і Габрусь Малююць роены гай
Малююць Беларусь: І зайчыка ў rai.
Раку Дняпро і Сож І любяць родны край
І дзетак басанож. Мацней за ўсе краі.

*Данута Бічэль-Загнетава*

**Мана** — тое, што **хлусня.**

**Мара — мечта.**

**Маркота — печаль, уныние, грусть**

На ката найшла маркота:
Ён не мае добрых ботаў. ^

*Уладзімір Мазго*





www.kamunikat.org

1

# М

**Маркотны — печальный, унылый, грустный.**

**Марнаваць — тратить, изводить, переводить попусту.**

**Марны — напрасный, бесполезный, пустой.**

**Марудзіць — медлить.**

**Марудлівы — медлительный, неторопливый.**

**Марудны — медленный; медлительный.**

**Марыць — мечтать.**

Пра сустрэчы марачы,
Завітай да Нарачы,
Дзе сяброў прыняў
Летнік "Зубраня".
Сосны расступіліся —
І вачам адкрыліся
Раптам карпусы
Казачнай красы.
*Уладзімір Мазго*



**Масляк — маслёнок.**

**Мастак — художнік.**

Кніжку ты бярэш у рукі —
Падабаюцца малюнкі.

Хто ж яе аздобіў так?
Кніжку афармляў мастак.
*Ніна Галіноўская*







www.kamunikat.org

# М

**Матуля — матушка, мама, маменька.**

**Матчын — материнский.**

Родная, матчына. Што ні вазьмі —
Усё называв нам, робіць людзьмі. *(Мова)*

*Міхась Пазнякоў*

**Маўленне — речь.**

**Маўленчы — речевой.**

**Месяц — 1) двенадцатая часть года; 2) луна.**

Вецер, вецер, пачакай!
Жоўты шарык мой аддай!
— Не крыўдуй, — сказаў мне вецер. —
Паляціць твой шар па свеце.
А затым праз месяц
Паляціць на Месяц.
Не забудзь тады адно:
Перад сном зірні ў акно!
*Алесь Бадак*

**Мець — иметь.**

**Мілагучны — благозвучный.**

**Мільгаць — мелькать, мерцать.**

**Мінулы — прошлый, прошедший.**

**Мітуслівы — суетливый.**

**Млын — мельница.**

♦ Млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе. (Язык мой — враг мой.)



www.kamunikat.org

# М

**Мова — 1) язык; 2) речь** (способность говорить).

Прад табой — старойкі кніг
З мілым, любым, родным словам,
Там бруіцца наша мова —
Мова прадзедаў тваіх.

*Кастусь Жук*



**Можа, мо — может, может быть.**

Ты хто? Украінец?
Малдаванін? Мо кубінец?
Англічанін? Ці француз?
— Не, няпраўда... *(беларус).*

*Алесь Бадак*

**Моладзь — молодёжь.**

**Морква — морковь.**

**Моўчкі — молча.**

**Моцны — 1) крепкий;** 2) **сильный.**

♦ Старасць — слабая на ногі, моцная на розум.



**Мужнасць — мужество.**

**Музыка — музыкант.**

**Муляр — каменщик.**

I глядзеў, нібы на дзіва
Васілёк тады,
Як сцяну кладзе рупліва
Муляр малады.

Браў навобмацак цагліну,
Стукаў кельмай* ён — І ў
паветры плыў хвіліну
Меладычны звон.

*Мікола Маляўка*

* Кельма — мастерок.



www.kamunikat.org

# М



**Мураш, мурашка — муравей; мурашка.**

Дзе мурашнік — там сям'я,
Мурашоў — сто тысяч "я"!
Станем дружна ў карагод,
Здзівім мы лясны народ.

*Таццяна Мушынская*



**Мурашнік — муравейник.**

Мур у лесе таямнічы,
Жыхароў — ніхто не злічыць.
Завіхаюцца мільёны
У працы дзеля абароны.
Кожны — пільны і адважны.
А завецца мур* — мурашнік.

*Уладзімір Мазго*

* Мур — *тут:* строение.

**Муро́г — мурава.**

**Мыць — 1) мыть; 2) стирать.**

**Мэбля — мебель.**



Гэта — мэбля. І з лазы
Найчасцей* бывае.
Разгайдаеш палазы —
Добра пакачае. *(Крэсла-качалка)*

*Міхась Пазнякоў*

* Найчасцей — чаще всего.

**Мянушка — прозвище, кличка.**

**Мясціна — место, местность, уголок.**

**Мясцовасць — местность.**



www.kamunikat.org

# Н

**Наадварот** — **наоборот.**

**Набракаць** — **набухать, разбухать.**

**Набрыняць** — **набухнуть, набрякнуть.**

**Набыць** — **приобрести.**

**Навакол, навокал, наўкола** — тое, што **вакол.**

**Наваколле** — **окрестность.**

**Навальніца** — **гроза.**

**Нават** — **даже.**

**Наведаць** — **посетить, навестить.**

**Навек** — **навсегда.**

Ад калыскі і навек
Самы блізкі чалавек. *(Мама)*
*Мікола Маляўка*



**Навіна** — **новость.**
Тэлеантэны не ад страху
Уздрыгваюць на кожным даху,
Яны павінны штохвіліны
З усёй зямлі лавіць навіны.
*Рыгор Барадулін*

**Навобмацак** — **на ощупь.**



www.kamunikat.org

# Н

**Навошта, нашто — зачем.**



Прыбегла мышка ў магазін:
— Прадайце званочак адзін.
— Навошта?
— На шыю катку,
Каб чуць, у якім ён кутку.

*Ніна Галіноўская*

**Нагадаць — напомнить.**

Рыба я. Яка я?
Хай кожны адгадае.
А фатаграфію маю
Калі вам паказаць,
То я магу змяю
Сабою нагадаць. *(Вугор)*

*Міхась Пазнякоў*

**Нагода — причина, случай.**



Вожык сцеражэцца
І зімой і летам.
Можа, й не стрыжэцца
Ён з нагоды гэтай,
Бо ў яго суседка
Ліска Лізаветка.
*Алесь Пісьмянкоў*

**Надакучыць — надоесть.**

**Надворак — двор** (возле дома).

**Надвор'е — погода.**

**Надвячорак — предвечернее время.**

**Надзея — надежда.**

Бацька і маці выхоўвалі сына.
Сын быў уцехай, надзеяй адзінай.

*Уладзімір Дубоўка*

www.kamunikat.org

# Н

**Надзвычай — необыкновенно, чрезвычайно, исключительно.**

Там бабёр на ўзбярэжжы Крот-сусед надзвычай лоўкі
На кавалкі дрэвы рэжа. Мае лапы, як рыдпёўкі.

*Станіслаў Шушкевіч*

**Надта — очень, слишком.**



**Нажнщы — ножницы.**

**Назапасіць — запасти.**

**Назаўжды, назаўсёды — навсегда.**

Ты працаю славутая, Цярплівая, пакутная,
Карміцелька-зямля. Ты назаўжды мая.

*Ні на Галіноўская*

**Назва — название.**

**Назіраць — 1) наблюдать; 2) присматривать, следить.**

**Назнарок, наўмысна — нарочно, умышленно.**

**Назола — надоеда, приставала.**



**Найперш — прежде всего, в первую очередь.**

**Напалохаць — испугать, напугать.**

**Напаткаць — встретить.**

І шла да бабулі дзяўчынка
Знаёмай лясною сцяжынкай.
І кожнае дрэўца дзяўчынку вітала.
Ды раптам яна ваўка напаткала. *(Чырвоная Шапачка)*

*Ні на Галіноўская*

**Напрадвесні — на исходе зимы; ранней весной.**



www.kamunikat.org

# Н

**Напрамак** — тое, што **кірунак.**

**Нараджэнне — рождение.**

**Нарэшце — наконец.**



**Насенне — семена.**

♦ Якое карэнне, такое і насенне.

(Каково семя, таково и племя.)

**Наскі — наш.**

**Настаўнік — учитель.**

**Настаўніца — учительница.**

Яна шануе веды Светлая, як раніца,
І знае ўсе сакрэты, Школьная настаўніца.

*Уладзімір Мазго*



**Настольнік — скатерть.**

**Настрой — настроение.**

**Насустрач — навстречу.**

**Наталяць — утолять.**

**Нахіліцца — наклониться.**

Вася, хлопчык невялічкі,
Нахіліўся да крынічкі:
— Ой, дзядулечка, зірні:
Хто глядзіць там з глыбіні?!
І рукою мне махае,
І язык свой выстаўляе...
Дзед нагнуўся: — Сапраўды:
Двое ўжо глядзяць з вады.

*Васіль Зуёнак*

**Неахайны — неопрятный, неряшливый; небрежный.**

# Н

**Небарака — бедняга, бедолага.**

Наш Андрэйка небарака:
Наш Андрэйка любіць плакаць.
Ён па шмат разоў на дзень
То спаткнецца, то ўпадзе.
*Алесь Ставер*



**Небяспека — опасность.**

**Небяспечны — опасный.**

**Неверагодны — невероятный.**

**Невідушчы — незрячий, слепой.**

**Недарэка — недотёпа.**

Недарэка, недарэка — Пеця ў бойцы так стараўся!
Певень Пеця Кукарэкін! Бедны, без хваста застаўся.
*Таццяна Мушынская*

**Недзе — где-то.**

**Незвычайны — необыкновенный.**

Незвычайная дзяўчынка
Прыляцела на галінку.
Стала на лісток,
Быццам на масток. *(Дзюймовачка)*
*Ніна Галіноўская*



**Некалі — когда-то.**

**Нельга — нельзя.**

**Нерат — рыболовная сеть.**

♦ Трапіў, як шчупак у нерат — ні ўзад ні ўперад в переплёт.)

# Н

**Нетры — 1) недра; 2) дебри, чаща.**

У час цяжкі ў лясныя нетры
Радзіма склікала сыноў.
*Мікола Аўрамчык*

**Неўзабаве — вскоре.**



**Неўпрыкмет — незаметно.**

**Нехта — кто-то; некто.**

**Нечаканы — неожиданный.**

**Нешта — что-то.**

**Нейк — как-то, однажды.**

**Нібы, нібыта** — тое, што **быццам.**

**Ніва — нива, пашня.**

**Нягеглы — 1) неказистый; 2) тщедушный.**

**Нядзеля — воскресенье.**

А зараз ад сям і —
Ад тыдзеньскай сям'і —
Два дні мы адымаем —
І ўсе адпачываем!
Субота і нядзеля —
Вясёлыя падзеі!
*Васіль Зуёнак*

**Нядоля — горе, несчастье, недоля.**

**Нязвычны — непривычный; необычный.**

**Нязгода — несогласие.**

**Няспынна — непрерывно, беспрерывно.**

**Няхай, хай — пусть, пускай.**

Няхай мак, няхай грэчка,
Абы толькі не спрэчка.
*Васіль Вітка*

# П

**Паабапал** — тое, што **абапал.**

**Паасобку** — **1) отдельно; 2) врозь.**

**Пабольшаць** — **увеличиться, стать больше.**

**Пабудаваць** — **построить.**



Яму не патрэбны піла і тапор —
Хаціну без іх пабудуе бабёр.

*Міхась Пазнякоў*

**Павага** — **уважение.**

**Паважаны** — **уважаемый, почтённый.**

**Павека** — **веко.**



**Паверх** — **этаж.**

**Павета** — **воздух.**

**Павінен** — **должен.**

Заўтра я павінна ўстаць
Раненька, з зарою:
Пойдзем зёлкі мы збіраць —
Людзям на здароўе.

Святаяннік, дзівасіл,
Сухацвет і піжму —
Каб было на лекі ўсім —
Буду рваць я ўвішна.

*Ніл Гілевіч*

**Паводзіны** — **поведение.**

**Паводка** — **1) половодье, паводок; 2) наводнение.**

# П

**Павольны — медленный, неторопливым.**

**Павявацъ — веять, дуть.**

**Пагалоска — молва, слух.**

**Пагорак — пригорок, холм.**

**Падабацца — нравиться.**

Лепш не кратай, лепш не руш*
Мой дзіравы капялюш!
Падабаецца — надзень,
Але толькі на дзень!

*Васіль Вітка*



* Не руш — не чапай.

**Падарожжа** — тое, што **вандроўка.**

**Падарожнічаць** — тое, што **вандраваць.**

**Падарунак — подарок.**

Гэта лепшы падарунак
З тых, што мне ў жыцці дарылі:
Не з прысмакамі пакунак,
А жывы сабачка Вілі.

*Леанід Пранчак*



**Падворак** — тое, што **надворак.**

**Падвячорак — полдник.**

**Падзея — событие.**

**Падзякаваць** *(каму)* — **поблагодарить** *(кого),*

**Падкрэсліць — подчеркнуть.**

**Падлетак — подросток.**

www.kamunikat.org

# П

**Падлога — пол.**

Кот вясёлы са стала На стале адна была —
Скінуў вазу на падлогу. На падлозе стала многа.

*Рыгор Барадулін*



**Падручнік — учебник.**

**Падтрымаць — поддержать.**

**Падэшва — подошва.**

**Пазіраць — смотреть.**

**Пазніцца — опаздывать.**

**Пазычыць — одолжить.**

**Пакараць — наказать.**

Сёння Шарык пакараны;
На прагулку не вазьму:
Кветкі, травы патаптаны.
Як не сорамна яму!

*Ніна Галіноўская*

**Пакінуць — оставить.**

**Пакой — комната.**

Што такое?
Чыста стала ўсё ў пакоі.
На падлозе, стэлажах
Хто на пыл наводзіць жах?



Гэта ў нас працуе добра
Шустрая электракобра.
У разетку хвост уткні —
І любуйся з чысціні! *(Пыласос)*

*Рыгор Барадулін*

**Пакрыўдзіць — обидеть.**

**Пакуль — пока, покуда.**

Я бягу, і ён бяжыць. Я іду, і ён ідзе, Я стаю, і ён стаіць. Аж пакуль не згасне дзень. *(Цень)*

*Міхась Пазнякоў*



www.kamunikat.org

# П

**Пакунак — свёрток.**

**Пакутаваць — страдать.**

**Пакутны, пакутлівы — 1) страдальческий;**

**2) мучительный.**

**Палахлівы — пугливый.**



**Палац — дворец.**

Стаіць палац. Але які! —
Прыгожы дужа, спраўны надта.
Відаць, рабілі мастакі,
Якіх і ў нас цяпер багата.

*Уладзімір Дубоўка*

**Палетак — клин.**

= Поле, якое выкарыстоўваюць пад пасевы.

На палетку пойдзе калій,
Што з глыбінь зямлі дасталі.

*Уладзімір Дубоўка*

**Паліто — пальто.**

**Палова — половина.**

Я — адна з дзвюх роўных частак.
Сустракаюся ўсім часта. *(Палова)*

*Міхась Пазнякоў*



**Палон — плен.**

О, рэкі Прынямоння!
У вашым я палоне
Шчасліва заміраю.
Вы — чараўніцы краю.

*Уладзімір Мазго*



www.kamunikat.org

# П

**Палонка — 1) полынья; 2) прорубь.**

— Мамачка, галубка, — просіць сын так міла, —
Можа б, ты на рэчку пагуляць пусціла?
— Ну, ідзі, сыночку, толькі апраніся,
Ды глядзі ў палонку, сынку, не ўваліся.

*Якуб Колас*

**Палуднаваць — обедать.**

**Пальмнець — пламенеть.**

**Пальчатка — перчатка.**



Рукавіцы ў мяне, а пальчаткі ў таты,
Я прымераў іх — яны мне велікаваты.
Аграмадныя яны, цяжкія, як вёслы.
Паглядзіце на мяне: я зусім дарослы!

*Леанід Пранчак*

**Паляванне — охота.**

**Памер — размер.**

**Памыліцца — ошибиться.**

— Што ты, што ты, шэры воўк!
Памыліўся ты, браток.
Хлопчык наш не крыўдзіць меншых,
Не смяецца са слабейшых.
Разам з імі ён гуляе.
Калі трэба — памагае.
Вельмі ціхі наш сынок.
Памыліўся ты, браток.

*Алесь Бадак*



**Памылка — ошибка.**

**Памяшканне — помещение.**

# П

**Панчоха — чулок.**



**Панядзелак — понедельник.**

**Папера — бумага.**

Сшытак спісаны, шпалеры —
Будзе новая папера.
*/Іеанід Дайнека*

**Папялушка — золушка.**

Імя, як сонейка, пяшчотнае.
Сама прыгожая, лагодная.
На баль прыехала ў карэце,
Якой няма у цэлым свеце. *(Папялушка)*
*Ніна Галіноўская*

**Папярэдзіць — предупредить.**

**Папярэднічаць — предшествовать.**

**Пара[1] — пара.**

**Пара[2]** *ж.* **— пар м.**



**Пара — 1) пора; 2) время.**

**Парада — совет.**

♦ Добрая парада дарагога варта.

**Парадзіць, параіць — посоветовать.**

**Парасон — зонтик.**

Знаходзіцца дома ў сонечны дзень.
А вось у дажджлівы — гуляць ён ідзе. *(Парасон)*
*Міхась Пазнякоў*

**Парастак — побег, отросток, росток.**

**Параўнаць — сравнить.**



www.kamunikat.org

**Парэчкі — смородина.**



Парэчча — слаўная мясціна,
Куток прыгожы і вясёлы:
Як мора лес, як неба долы,
Зіхціць у кветках лугавіна.
А колькі ягад і парэчак!
Як пахне мёдам поле грэчак!

*Якуб Колас*

**Паспешлівы — торопливый.**

**Паспяховы — успешный.**

**Паступова — постепенно.**

**Патрэбна — нужно, необходимо.**



Размаўляе дзяцел сам з сабой:
— Я зусім не шкоднік, не каўбой:
Мне сасну патрэбна палячыць —
Пад карою мошак не злічыць.

*Ніна Галіноўская*

**Патрэбны — нужный, необходимый.**

Летам я рагатая,
Восенню — хвастатая.
Хоць і горкая зусім,
Ды патрэбная ўсім. *(Цыбуля)*

*Міхась Пазнякоў*

**Патэльня — сковорода.**



Каб дастаць патэльню з печы,
Чапяла зусім дарэчы.
— Грэбці жар? Мая чарга! —
Заяўляе качарга.

*Артур Вольскі*



www.kamunikat.org

# П



**Пах — запах.**

**Пахіснуцца — пошатнуться.**

**Пацвердзіць — подтвердить.**

**Пацеркі — 1) бусы; 2) бисер.**

**Пацяплець — потеплеть.**

Яна галодная — хата халодная, яна пад'ела — у хаце пацяплела. *(Печ)*

**Пачастунак — угощение.**

**Пачатак — начало.**

**Пачвара — 1) чудовище; 2) урод.**

**Пачварны — безобразный; уродливый.**

**Пачуць — 1) услышать; 2) почувствовать, ощутить.**

**Пачырванець — покраснеть.**

**Пашана — почёт; почтение.**

**Паштальён — почтальон.**

**Паштоўка — открытка.**

**Пашча — пасть; зев.**



**Певень — петух.**

Паднімае ўсіх на золку,  
Носіць на хвасце вясёлку.  
Рыцарскія шпоры мае,  
Свой гарэм* абараняе.

*Уладзімір Мацвеенка*

* Гарэм — *тут:* куры з куранятамі.

www.kamunikat.org

# П

**Пекар** — **пекарь.**

**Пекла** — **ад.**

Ім музыка вельмі шкодзіць:
Ад грахоў людзей адводзіць.
Зажадалі ў пекле чэрці
Памагчы яму памерці.

*Уладзімір Дубоўка*



**Пекната** — **красота.**

Пучша там не мае краю,
Пекната ж у ёй такая,
Што нідзе няма на свеце,
Хоць усюды сонца свеціць.

*Уладзімір Дубоўка*

**Пераказ** — **пересказ, изложение.**

**Пераклад** — **перевод.**

**Пераконваць** — **убеждать.**

**Перакрыжаванне** — **перекрёсток.**

**Перамагаць** — **побеждать.**

**Перамагчы** — **победить.**

Вярнуўся асілак з далёкіх дарог.
Злога разбойніка ён перамог.
Вітай пераможцу, моўчкі не стой.
Як называецца гэты герой? *(Ілья Мурамец)*

*Ніна Галіноўская*



**Перамога** — **победа.**

**Пераможца** — **победитель.**



www.kamunikat.org

# П

**Перапынак — перерыв; перемена.**

Як бяжым на перапынак,
Чуюць хлопчыкі наказ:
— Паважайце ж вы дзяўчынак —
Будуць паважаць і вас!

*Эдзі Агняцвет*

**Перашкода — преграда.**

Але кажуць, што бядзе
Перашкод няма нідзе.

*Уладзімір Дубоўка*

**Пернік — пряник.**

Пчаляр у пчол найпершы лекар.
Пячэ духмяны пернік пекар.

*Рыгор Барадулін*



**Перш — прежде, сперва.**

**Першы — первый.**

**Песціць — баловать; лелеять.**

**Пеўнік — петушок.**

**Пехатой, пехатою — пешком.**

**Пілаваць — пилить.**

**Пільна — внимательно.**

**Пільнаваць — охранять, стеречь, караулить.**

**Пільны — 1) зоркий; 2) тщательный, внимательный.**

**Пінжак — пиджак.**

Жук пытаецца ў жука:
— Ты чаму без пінжака?
— Я памыў свой пінжачок
і павесіў на сучок.

*Ніна Галіноўская*



www.kamunikat.org

**Пісьменнік — писатель.**

**Плодны — плодовитый.**

**Плот — забор.**

Таўстунчык паласаты
На семечкі багаты,
Абжыўся ў агародзе,
А хвост — вісіць на
плоце. *(Гарбуз)*

*Мікола Маляўка*



**Плотка — плотва.**

**Плошча — площадь.**

**Плыт — плот.**

**Плюскат — плеск.**

**Плюхота — слякоть.**

**Пляцоўка — площадка.**

**Побач — рядом.**

Ідзе да нас бабуля завеяй снегавой,
А побач з ёй — дзядуля з бялюткай барадой. *(Зіма і мароз)*

**Погляд, пагляд — взгляд; взор.**

Погляд кідаю ў бакі:
У бары — баравікі.
Пахаваліся пад мох —
Разгадаў-такі падвох.
*Уладзімір Мазго*



**Позірк** — тое, што **погляд.**



www.kamunikat.org

# П

**Покуць — красный угол.**

= Пачэснае месца ў хаце.

Бог жыве на небе,
Бог жыве ў царкве.
А ў вясковай хаце
Дзе ён, Бог, жыве? *(На покуці)*
*Мікола Маляўка*

**Попел — пепел, зола.**



**Поплаў — пойма, заливной луг.**

**Посуд — посуда.**

**Посцілка — постилка; покрывало.**

**Поўдзень[1] — юг.**

На лазе паспеў на поўдні,
Сокам сонечным напоўнен. *(Вінаград)*
*Міхась Пазнякоў*

**Поўдзень[2] — полдень.**

**Поўнач[1] — север.**



**Поўнач[2] — полночь.**

**Поўніць — наполнять, полнить.**

**Поўсць — шерсть.**

**Пошта — почта.**

**Пошук — поиск.**

♦ Не той грыб, што ў пошуку, а той, што ў кошыку.

**Прабачыць** *(каму)* — **простить** *(кого, кому)*, **извинить** *(кого)*.

**Прабачэнне — извинение, прощение.**



www.kamunikat.org

# П



**Празрысты — прозрачный.**

**Пралеска — пролеска, перелеска.**
Белыя бярозы — Мы цябе, пралеска,
Разам зашапталі: Усю зіму чакалі.
*Вера Вярба*

**Праменісты, прамяшсты — 1) лучистый; 2) лучезарный.**

**Прамень, промень — луч.**

**Пранізлівы — 1) пронзительный; 2) пронизывающий.**

**Прапанаваць — предложить.**

**Прас — утюг.**

Рэчачка льняная, лодачка стальная.
Я лодачку паганяю і ўсе хвал і параўняю. *(Прас)*
*Васіль Вітка*

**Прасаваць — утюжить.**
Шыпіць гарачы прас:
— Вада — мая сяброўка.
Тваю хусцінку ўраз
Я адпрасую лоўка.

Шыпіць гарачы прас, І
шык яго дарэчы:
Дзяўчынка першы раз
Свае прасуе рэчы.
*Кастусь Жук*



**Праснак — опреснок.**

**Праўда — правда.**

**Праца — труд; работа.**

Хараство ўсё ідзе ад працы,
Пабудавала праца і палацы.
*Уладзімір Дубоўка*

♦ Хвалько любіць хваліцца, а ў працы не гадзіцца.

www.kamunikat.org

# П



**Працаваць — трудиться; работать.**

Мы за парты дружна селі,
Мы працуем усур'ёз,
А налета зноў арэлі
Разгайдаем да нябёс.

*Мікола Маляўка*

♦ Працаваць не любіш — чалавекам не будзеш.

**Працавіты — трудолюбивый.**

Працавіты — павучок.
Выткаў мусе гамачок.
Кажа: — Гушкайся, суседка!
Мушка скок: — Ой, гэта ж сетка!

*Ніна Галіноўская*

**Працаўнік — труженик.**

**Працоўны — трудовой.**

І руплівая пчала
Дзень працоўны пачала.
Што ж ты спіш усё, малы,
Што не вучышся ў пчалы?

*Алесь Пісьмянкоў*



**Працяг — продолжение.**

**Прозвішча — фамилия.**

**Прыблізна — приблизительно.**

**Прывабны — 1) привлекательный; 2) заманчивый.**

**Прыгадаць — вспомнить, припомнить.**

**Прыгажосць — красота.**

**Прыгажуня — красавица.**



www.kamunikat.org

# П

**Прыгода — приключение, происшествие.**

— Хай першай скажа Ружа
Пра ўсе свае прыгоды.

— Здаволена я дужа
Сваім мінулым годам.

*Уладзімір Дубоўка*

**Прыгодніцкі — приключенческий.**

**Прыгожы — красивый.**



**Прыемны — приятный.**

**Прыказка — пословица.**

А хто шукае, той знаходзіць.
Такая прыказка ў народзе.

*Уладзімір Дубоўка*

**Прыклад — пример.**

Уся са свету прыгажосць,
Што ў нас была ці, можа, будзе,
У сонечным палацы ёсць,
З яе каб прыклад бралі людзі.

*Уладзімір Дубоўка*

**Прыкмеціць — заметить, подметить.**

**Прымаўка — поговорка.**

**Прымацаваць — прикрепить.**

**Прыпынак — остановка.**

**Прысмакі — лакомства; сласти.**

Нясуць прысмакі мне:
Варэнне, сыр, аладкі.
Бо я ўсю ноч у... сне
Палола з мамай градкі.

*Мікола Маляўка*





www.kamunikat.org

# П

**Прыступка, прыступак — ступенька, подножка.**

**Прытулак — приют, пристанище.**

**Прытулішча — 1) прижаться; 2) приютиться.**

**Прыцемак — 1) полумрак; 2) сумерки.**

**Прыязны — дружелюбный, доброжелательный.**

**Прэч — прочь.**

Дык чаму, з якой прычыны
Ліска лезе з-пад ляшчыны?
Лепш ляці, зайчо, хутчэй
Прэч ад лісчыных вачэй.

*Артур Вольскі*

**Псаваць — портить.**

**Птах — птица** (обычно большая).

— Цёх-цёх-цёх, ціву-ціў... —
Птах мелодыю разліў.
Сакавітая, чыя
Гэта песня?.. *(Салаўя).*

*Міхась Пазнякоў*



**Птушка — птица.**

Зойка-весялушка ўсё малюе птушак.
У альбоме ў Зойкі шчабятун-салоўка,
Жаўранак і грак, кнігаўка і шпак,
Дрозд і мухалоўка, і круцігалоўка*.

*/ Васіль Жуковіч*



* Круцігалоўка — вертишейка.

www.kamunikat.org

# П

**Пуга — кнут.**

Ехала на коніку Пугаю махала,
Муха па сасонніку. Песеньку спявала.
*Алесь Бадак*

**Пугач — филин.**

**Пульхны — 1) мягкий, пушистый; 2) пышный.**
А з пшанічнае мукі
І выходзіць хлеб такі:
Белы, нібы вата,
Пульхны, наздраваты.
*Сяргей Грахоўскі*



**Пупышка — почка** (на деревьях).

**Пчаляр — пчеловод.**
Выйшаў з хаты з дымаром
Дзед, пчаляр заўзяты.
*Якуб Колас*

**Пыл** м. — **пыль** ж.

**Пыласос — пылесос.**

**Пырскі — брызгі.**
Распранаючыся з ходу, Хлопцы
ўсе палезлі ў воду.
Паляцелі ў неба пыркскі У
залатым праменні бліскаць.
*Уладзімір Дубоўка*

**Пытанне — вопрос.**
Пяць няпоўных год Алежку, Ды
ў яго пытанняў шмат: — Хто
пасеяў сыраежкі?
— Хто атрос увосень сад?
— Хто нябачнаю рукою
Мост малюе над ракою?..
*Кастусь Жук*

# П

**Пытацца, пытаць — спрашивать.**

**Пышка — пышка.**

= Круглая, пульхная булачка.

♦ Працаўніку — мядовыя пышкі, а гультаю — яловыя шышкі.

**Пэндзаль — кисть.**

Фарбы, пэндзаль і мальберт —
Я малюю свой партрэт.
Вочы — кропкі, броваў лёт.
Круглы, выпуклы жывот.
Чырвань шчокаў, бульбай нос.
Я страшнючы, як Барбос.
*/Іеанід Пранчак*



**Пэндзлік — кисточка.**

**Пэўны — определённый.**

**Пэцкаць — пачкать.**

**Пякарня — пекарня.**

**Пялёстак — лепесток.**

**Пярсцёнак — перстень, кольцо.**

**Пярэсты — пёстрый.**

**Пярэчыць — возражать, противоречить.**

**Пясняр — певец, поэт.**

**Пястун — 1) баловень; 2) неженка.**

**Пячкур — пескарь.**

**Пячы — 1) печь; жарить; 2) жечь, саднить.**

**Пяшчота — нежность.**

**Пяшчотны — нежный.**



www.kamunikat.org

# Р




**Рабіць — делать; работать.**

**Рабы — пёстрый, рябой.**

**Рагатаць — хохотать.**

За дрэва хаваецца, Спявае, рагоча,
На крыкі адгукаецца, Сустрэцца не хоча. *(Рэха)*

*Васіль Карпечанка*

**Рада — 1) совет; 2) совещание.**

Без ніякага адкладу
Кліча ён сыноў на раду.
Пасадзіў усіх на лаве
І пачаў казаць аб справе.

*Уладзімір Дубоўка*

**Радаўніца — Радуница.**

= Дзевяты дзень пасля Вялікадня, калі памінаюць, ушаноўваюць памяць памерлых.

На Радаўніцу моляцца ў царкве, наведваюць магілы родных, успамінаюць сваіх продкаў.

**Радзіма — Родина.**

= Краіна, якая належыць народу і з'яўляецца месцам нараджэння і жыцця каго-небудзь; Бацькаўшчына, Айчына

Перад вачыма — наша Радзіма:
Росаў бязмежжа і Белавежа.
Нёман адбіўся ў матулі ў вачах.
Тут ты радзіўся і выйшаў на шлях.

*Данута Бічэль-Загнетава*





www.kamunikat.org

**Радзімка — родинка, родимое пятно.**



Кажа ў садзе Юлька Дзімку,
Яблык круцячы ў руцэ:
— Глянь, на яблыку — радзімка,
Нібы ў мамы на шчацэ.

*Яўген Хвалей*

**Радзіць — советовать.**

**Разам — вместе; сообща; заодно.**

Мышаняты сябравалі,
Кошку разам малявалі:
Ажыла... Чакай бяды!
Разбягайся хто куды!

*Таццяна Мушынская*



**Разбараніць — разнять дерущихся.**

Знайшлі пеўні зломак-грэбень. Потым біцца, калаціцца... А нашто ён ім патрэбен?
Як схапіліся сварыцца,
Ледзьве іх разбараніла,
Памірыцца ўгаварыла.

*Васіль Зуёнак*

**Разблытаць — распутать.**

**Разбурыць — разрушить.**

**Разважаць — рассуждать.**

**Развіднець — рассвести.**
**Развітацца — попрощаться, проститься.**

Карагод яны [мышы] вадзілі, У званок яны званілі І спявалі дружным хорам: — Развітаемся мы з горам!

*Уладзімір Дубоўка*

www.kamunikat.org

**Разводдзе — половодье. Разгайдаць — раскачать, расколыхать. Разгалісты — раскйдистый.**

**Разгубіцца — растеряться.**

**Разлог, разлога — простор, раздолье**

Адным крылом звярынец гэты
Сюды выходзіў на дарогу.
Займаў ён цэлую разлогу:
І лес, і луг, і часць крыніцы.

*Якуб Колас*

**Размаўляць — разговаривать.**

**Размеркаваць — распределить**

**Размова — разговор.**

Пад падлогаю сасновай
У мышэй пайшла размова:
Як далей ім жыць на свеце,
Чым карміць малыя дзеці?

*Уладзімір Дубоўка*



**Разумець — понимать.**

Мішава бабуля
Вышыла кашулю
Мішаваму тату,
Каб насіў у святы.
— Разумею, — кажа
Хлопчыку गануля, —
Рукі залатыя
У тваёй бабулі.

*Васіль Жуковіч*



www.kamunikat.org

# Р

**Разумны — умный, толковый.**

**Разынка — изюм.**



Калі даспелы вінаград
Сушыць на сонцы ці ў жароўні,
То атрымаецца з я го
Прадукт выдатны і цудоўны.
Разынкі — лета цеплыня
І вінаграднікаў духмянасць.

*Леанід Пранчак*

**Разява, разявака — разиня.**

**Раз'юшаны — рассвирепелый; разъярённы й.**

**Раіць** — тое, што **радзіць.**

**Раіцца — советоваться.**

**Ракітнік — ракитник.**

= Зараснік ракіты, кусты ракіты.



Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка,
Абодва берагі каторай
Лазняк, ракітнік абступалі.

*Якуб Колас*

**Ралля — пашня.**

= Узаранае поле.

Не ралля, а пух узняты!
Хутка ў ім растуць зярняты!

*Уладзімір Дубоўка*

**Рамонак** м. — **ромашка** ж.



www.kamunikat.org

**Ранак, раніца — утро.**

**Ранне — тое, што ранак.**



Шпак вясёлы на шпакоўні,
У яго настрой цудоўны.
Не праспаў ён ранне,
Не праспаў сняданне.
Накарміў сваіх дзяцей,
Славіць сонца чыстае, —
Тых, хто спіць за ўсіх пазней,
Ён цяпер абсвістае.

*Яўген Крупенька*

**Ранет — ранет.**

= Сорт яблыні, а таксама яе плод, салодкі на смак.

Стомлены вяртацца будзеш летам
Па дарозе той, —
Асвяжыш душу сваю ранетам,
Бэрай* залатой.

*Пімен Панчанка*



* Бэра — берё (сорт груши).

**Раніцай, раніцой — утром.**

Летам ён доўгі, але карацейшы зімой.
Знікае пад вечар, прыходзіць ізноў раніцой. *(Дзень)*

*Міхась Пазнякоў*

**Раптам — вдруг.**

**Раптоўна — внезапно.**

Яна і рот раскрыла,
Каб дар схапіць цудоўны,
Ды ў рот нячыстай сілы
Зваліўся нож раптоўна.

*Уладзімір Дубоўка*



www.kamunikat.org

**Расквечаны — расцвеченный.**

**Расклад — 1) расклад; 2) расписание.**

**Расліна — растение.**

Ёсць расліна ў нас такая,
Як ніякая другая:
Яна ў стэпе ўзрастае,
Звонку выгляд шара мае...
Як павее часам вецер,
Шар пакоціцца па свеце.

*Уладзімір Дубоўка*



**Распаліць — 1) расжечь; 2) раскалить.**

**Распранаць — раздевать.**

**Раставаць — таять.**

**Растлумачыць — объяснить.**

**Расчуліць — растрогать, взволновать, тронуть, умилить.**

**Расчуліцца — расчўвствоваться, растрогаться.**

**Расчыніць — раскрыть, распахнуть.**

**Ратаваць — спасать.**

Мы з дзядулем зайчанятка
Цэлы вечар ратавалі:
Праціралі ёдам рану,
Марляй лапку абвязалі.

*Леанід Пранчак*



**Ратунак — спасение.**



www.kamunikat.org

# Р

**Рахманы — 1) покладистый, кроткий; 2) ручной; смирный** (про животных).



Маленькі, рахманы,
А трэба — аддана
Засведчыць ён мужнасць сваю,
Адолеўшы ў бойцы змяю. *(Вожык)*

*Міхась Пазнякоў*



**Рашучы — решительный.**

**Розны — разный.**

**Розум — 1) ум, разум; 2) рассудок.**

Буй вал тыгру кажа: — Дружа!
Чалавек малы, нядужы,
Ды на розум ён багаты,
З нас і робіць памагатых.

*Уладзімір Дубоўка*

**Роля — роль.**

**Роены — росистый.**

**Роспач — отчаяние.**

**Рохкаць — хрюкать.**



А парасяткі, яе дзеці,
Усяму дзівілісь несканчона,
Бо надта рохкалі здзіўлёна.

*Якуб Колас*

**Ружа — роза.**

**Ружовы — розовы́й.**

**Руйнаваць — разрушать.**

=Ператвараць у руіны, разбураць, знішчаць.



www.kamunikat.org

# Р



**Рукавіца, рукавічка — варежка.**

У Колі знікла рукавічка.
Не рукавічка — проста знічка:
Так і глядзіць, каб знікнуць зноў —
Хоць прышывай да рукавоў.
*Галіна Каржанеўская*

**Румзаць — плакаць, реветь.**

**Рунь — озимые всходы, озимь.**
= Усходы, пасевы азімых.

**Руплівы — заботливый, старательный, усердный.**

Назбіраў руплівы вожык
Сыраежак поўны кошык.
*Пятро Сушко*



**Рухавы — подвижный, живой.**

**Рухацца — двигаться.**

**Ручаіна, ручай — ручей.**

**Ручнік — полотенце.**

У суботу Янка ехаў ля ракі,
Пад вярбой Алёна
Мыла ручнікі.
*Вера Вярба*



**Рыдлёўка — лопата.**

Што ты зробіш без машыны
Тут рыдлёўкаміаднымі?
*Уладзімір Дубоўка*

**Рызыка — риск.**
= Магчымая небяспека, пагроза чаму-небудзь.

www.kamunikat.org

# Р

**Рыпець — скрипеть.**

**Рыса — черта.**

**Рыхтаваць — готовить.**

Ёсць насенне! Зараз трэба
Рыхтаваць для проса глебу!
*Уладзімір Дубоўка*

**Рэйка — рельс.**

Дом на рэйках падкаціў,
Дзверы шчыра адчыніў.
Той, хто едзе, паспяшай,
Не затрымлівай трамвай!
*Міхась Пазнякоў*



**Рэха — эхо.**

Спявалі, зразумела,
Ім туравала* рэха.
*Уладзімір Дубоўка*

* Тураваць — вторить.

**Рэч — вещь.**

Добра вядомую свету
Рэч назавіце мне гэту.
Хто ні глядзіць на яе —
Бачыць заўсёды сябе.
*Міхась Пазнякоў*



**Рэчыва — вещество.**

**Рэчышча — русло.**

**Рэшта — 1) остаток; 2) сдача.**



www.kamunikat.org

# С



**Садавіна — фрукты.**

**Садзейнічаць — содействовать.**
= Падтрымліваць, дапамагаць.

**Сажалка — пруд.**

Старая сажалка зімой —
Хакейная пляцоўка.
Нам — месца гульняў і забаў,
А карасям — зімоўка.

*/Іеанід Пранчак*



**Сакавік — март.**

Абудзіўся сакавік
Жаўруковай песняй.
Сонца ярка распаліў —
Ручайкі наўкола,
Соку конаўку наліў
Сакавік вясёлы.

*Казімір Камейша*

**Сакавіты — сочный.**

**Сакавіцкі — мартовский.**

**Сакрэт — секрет.**

**Салата** ж. — **салат** м.

www.kamunikat.org

# С

**Сапраўды — действительно, точно.**

**Сапсаваць — испортить.**

**Сарамлівы — стеснительный, стыдливый.**

**Сасніць — увидеть во сне.**

**Сасоннік — сосняк.**

**Сачыць — 1) следить, наблюдать; 2) выслеживать.**

Грып ды Кашаль — два бандыты —
Зноў ваююць з Апетытам.
І ўсё сочаць, усё сочаць,
Апетыт украсці хочуць.
*Алесь Пісьмянкоў*



**Свавоціць — 1) шалить, озорничать, баловаться;**
**2) своевольничать.**

Хто спявае ў чыстым пол і
Між аўсяных ніў, далін?
Гэта вецер там свавоціць,
Ліст страсаючы з калін.
*Язэп Пушча*



**Свавольнік — шалунишка, озорник, баловник.**

**Сварыцца — ссориться, ругаться.**

**Сваяк — родственник.**

**Сваячка — родственница.**

**Сведка — свидетель.**

**Сведчыць — свидетельствовать.**



www.kamunikat.org

**Свет — мір.**

Ва ўсе краіны свету
Я разам з ім паеду.
І не патрэбна віза,
А толькі — тэлевізар.
*Уладзімір Мазго*



**Светнік — горицвет.**

**Свіння — свинья.**

**Свіран — амбар.**

♦ Кладзі гной густа, не бузе ў свірне пуста.

**Світанак, світанне — рассвет.**

На світанні, на зары
У зялёным гушчары,
Дзе мох сцелецца рабы,
Паспрачаліся грыбы.
*Максім Танк*



**Світаць — светать, рассветать.**

**Світка — армяк.**

= Доўгая сялянская вопратка з сукна
Яна ў клубку начуе,
Ёсць вушка, ды не чуе,
Зацягне ў вушка нітку —
Пашые дзеду світку. *(Іголка)*
*Мікола Маляўка*



**Свіцецца — просвечивать, пропускать свет.**

**Своеасаблівы — своеобразный.**

**Своечасовы — своевременный.**



www.kamunikat.org

# С

**Свята — праздник.**



Нас пакуль што небагата:
Мама, тата і Агата.
Каб было на сэрцы свята,
Дарагія мама, тата,
Мне для шчасця не хапае
Дога, ролікаў і... брата!
*/Іеанід Пранчак*

**Святаяннік — зверобой.**

= Травяністая лекавая расліна з жоўтымі кветкамі

**Святкаваць — праздновать.**



**Святло — свет.**

**Святочны — праздничный.**

**Сейбіт — сеятель.**

**Селянш — крестьянин.**

**Серада — среда.**

**Сёлета, сяголета — в этом году.**

**Сёмы — седьмой.**

**Сёння — сегодня, нынче.**

**Сёрбаць — хлебать, прихлёбывать.**

**Сіваваронка, сіваграк — сизоворонка.**

**Сівізна — седина.**

**Сівы — седой.**

**Сінявочка — синеглазка.**



www.kamunikat.org

**Сіраціна, сірата — сирота.**
= Дзіця, я кое застал ося без аднаго або без абаіх бацькоў.

Слёзы сіраціны не на камень падаюць, а на галаву крыўдзіцеля.

**Скарб — клад, сокровище.**
= Каштоўнасці, багацце, схаванае ці закапанае недзе.

— Эй, асілак! Зноў капаеш,
Можа, скарб які шукаеш?
— Не, нічога не шукаю,
Станцыю метро капаю. *(Экскаватар)*
*/Іеанід Пранчак*



**Скардзіцца — жаловаться.**

**Скарыначка — корочка** (хлеба).

**Скасавўрыцца — скоситься.**
= Паглядзець скоса, скрыва.

**Сквапны — жадный.**

І худзючы, і сквапны,
На здраду і подласць здатны.
Занудлівы і самотны.
Хто ён? *(Кашчэй Бессмяротны)*
*Ніна Галіноўская*



**Скеміць — сообразить.**
= Зразумёць, разабрацца, сцяміць.

Скеміў хутка пан вучоны,
Што на ўсё свае прычыны,
І надумаў на Сымона
Уласнымі зірнуць вачыма.
*Уладзімір Дубоўка*

**Скіба — ломоть** (хлеба); **пласт** (земли).

**Скінуць — сбросить.**

**Скіраванасць — направленность.**

**Склад** (у мове) **— слог.**
Са складоў складзецца слова,
Слова — добрых спраў аснова.
*Рыгор Барадулін*




**Складаны — сложный.**

**Скласці — 1) сложить; 2) составить.**

**Склеп — подвал.**




**Скнара — жадина, скопидом.**

♦ Скнара-скнарыца і за трэску пасварыцца.

**Скрозь — 1) везде, всюду; кругом; 2) сквозь.**

**Скронь** ж. **— висок** м.

Хоць скроні мае пабялелі,
Стаю прад табой [мамай] я малым.
*Генадзь Бураўкін*

**Скруха — печаль, тоска, сожаление.**
= Туга, маркота; жаль, шкадаванне.

**Скрыгатаць — скрежетать.**

Хай злыдні над намі скрыгочуць зубамі —
Любі сваю ніву, свой край.
*Янка Купала*

**Скрыжаванне — перекрёсток; пересечение.**

**Скрыня — ларь, сундук; большой ящик.**

**Скура — кожа.**

www.kamunikat.org

# С

**Скураны — кожаный.**

**Скуты — скованный.**

Месяц люты, з лёду скуты,
Снег сагнаў з тары на дол.
Наша возера як стол. *Данута Бічэль-Загнетава*



**Скупеча — тое, што скнара.**

А шчодры, сабраўшы бяседу,
Суседзяў частуе.
Скупеча пакажа суседу
Кішэню пустую.
*Янка Непачаловіч*

**Славуты — знаменитый, известный.**
= Праслаўлены, вядомы.

Славуты фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Жарэс Алфёраў вучыўся ў школе N° 42 г. Мінска.

**Сланечнік — подсолнечник, подсолнух.**

Са сланечніку вырабляюць алей.

**Слізгаць — скользить.**

**Слімак — улитка, слизень.**

Л ежабо ку-с л і м а ка
Не адрозніш ад лістка.
*Ніна Галіноўская*



**Слоўнік — словарь.**

**Слуп — столб.**

**Сляза — слеза.**

**Смага — жажда.**

**Смажыць — жарить, поджаривать.**



J

www.kamunikat.org

# С

**Смак — вкус; смак; удовольствие.**

Дастаўшы праснак, што матуля паклала,
Са смакам ён з'еў яшчэ ладны кавалак.
*Уладзімір Дубоўка*

♦ Працуем і смак чуем. (Умелые руки не знают

**Смактаць — сосать.**

Смокча мёд мядзведзь,
Сёрбае зацірку —
Хоча пахудзець,
Каб скакаць у цырку.
*Мікола Маляўка*



**Смачны — вкусный.**

Як сарвеш яго да часу,
Гарката апаліць рот.
Калі ж яблык сам паспее,
Будзе смачным, нібы мёд.
*Леанід Пранчак*

**Сметанковы — сливочный.**

**Смётнік — помойка, свалка.**

Барона гонар свой збаўляе
Ды зноў да сметніка вітае*.
*Якуб Колас*



* Вітаць — *тут:* направляться.

**Смецце — мусор, сор.**

На мятле, усе вы чулі,
Усе чулі і чыталі,
Страшная Яга-бабуля
Пад аблокамі лятае.
— А яшчэ, — сказаў мне Пеця, —
На мятле лятае смецце!
*Казімір Камейша*



www.kamunikat.org

# С

**Смоўж** — тое, што **слімак.**

**Смутак** — **грусть, печаль, тоска.**

Смуткам бядзе дапаможаш ты мала.
Вось і махнуў ён на смутак рукою.
Добрай вячэрай сябе супакоіў.

*Уладзімір Дубоўка*

**Смуткаваць** — **грустить, печалиться.**

**Смятанка** — тое, што **вяршю.**



**Снёданне, сняданак** — **завтрак.**

І чуць што толечкі раззднела,
У маткі снеданне паспела.

*Якуб Колас*

**Снежань** — **декабрь.**

Прастудзіўся лістапад,
Апрануць кажух ён рад.
Лістапад кажух надзеў
І зрабіўся снежнем.

*Іван Муравейка*



**Снежаньскі** — **декабрьский.**

**Сорам** — **стыд.**

**Сорамна** — **стыдно.**

Стала сорамна ўсім, Што ўвесь пачаўся бой
Як дазналіся аб тым, Ад гарошынкі малой.

*Уладзімір Дубоўка*

**Спагада** — **сочувствие, сострадание.**

[Дзяцел Саве:] — Ты заспявай, дазнаюся цяпер,
Чаму няма спагады да цябе.

*Уладзімір Дубоўка*



www.kamunikat.org

**Спадабацца — понравиться.**

**Спадарожнік — спутник.**

**Спадзяванне — надежда.**

**Спадзявацца — надеяться.**



**Спадніца — юбка.**

[Ліса:] — Напэўна, што завузка
Нейлонавая блузка,
А модная спадніца

Так цісне ў паясніцы.

*Васіль Вітка*

**Спадцішка — исподтишка.**

**Спазніцца — опоздать.**

Першакласніцы сарокі І трашчаць над борам:
Раз спазніліся на ўрокі — Сор-рам! сор-рам! сор-рам!

*Уладзімір Мазго*

**Спакой — спокойствие; покой.**

**Спаліць — сжечь.**

**Спалохацца — испугаться.**

**Спатканне — 1) встреча; 2) свидание.**

**Спаткацца — встретиться.**

**Спахапіцца — спохватиться.**

**Спачатку — 1) сначала; 2) вначале.**

Пачынаем дзень спачатку Раз — налева, два — направа,
Фізкультурнаю зарадкай. Крок наперад, крок назад.

*Андрэй Александраў*



www.kamunikat.org



**Спачуваць — сочувствовать.**

**Спевы, спеў — пение.**

Пад аблокі ўзлятае
І прыход вясны вітае, —
Льецца спеў высокі, чысты,
Мілагучны, прамяністы. *(Жаўранак)*

*Міхась Пазнякоў*

**Спёка** — тое, што **гарачыня.**

Ад спёкі ў гаі дзяды-салаўі
Ратуюцца іван-чаем.

Норма ў іх — самавар на дваіх,
Асушаць, другі закіпае.

*Васіль Вітка*

**Сплажыць — уничтожить.**

**Сподак — блюдце.**

**Спорны** — 1) **спорный;** 2) **убористый** (о почерке).

**Спрабаваць — пробовать.**

**Справа — дело.**

♦ Якая справа, такая і слава. (По труду и честь.)

**Спрадвеку — испокон веку, извечно.**

Неаднолькавыя дзеці,
Неаднолькава і шчасце.

Так спрадвеку ўсё на свеце
Падзялялася на часці.

*Уладзімір Дубоўка*

**Спрадвечны — извечный.**

**Спрачацца — спорить.**

Я спрачацца не бяруся —
Шмат азёр на Беларусі,

Але лепшае, чым Кромань,
Мне, папраўдзе*, невядома.

*Уладзімір Дубоўка*

* Папраўдзе — взаправду.

**Спружына — пружина.**

**Спрытна — ловко, умёло.**



За кругам робіць круг,
Садзіцца ён на луг.
Ні рук няма, ні лап,
А спрытна ловіць жаб. *(Бусел)*
*Мікола Маляўка*

**Спрытны — ловкий.**

= Лоўкі, паваротлівы, які валодае ўменнем у нейкай справе.

Спрытны — вогненны звярок
Напалохаў зноў сарок.
Прамільгнула яркай зоркай
Над галінамі вавёрка.
*Уладзімір Мазго*

**Спрэчка — спор, ссора.**




Яны [Агонь, Вада, Вецер] уступілі
У спрэчку між сабою,
Крычаць, шумяць, трасуцца
Ды за чубы бяруцца.
*Авяр'ян Дзеружынскі*

**Спытаць — спросить.**

**Спяваць — петь.**

**Спякота** — тое, што **гарачыня.**

Калісьці ў Афрыцы была бяда:
Гарачыня нязвычная, спякота.
З крыніц і рэчак знікла ўся вада.
Павысыхалі нават і балоты.
*Уладзімір Дубоўка*



www.kamunikat.org

# С

**Сродак — средство.**

**Ставіцца[1] — ставиться; строиться.**

**Ставіцца[2] — относиться** (проявлять своё отношение).
**Ставок — прудик.**

= Невялікая сажалка.

**Стагоддзе — век, столетие.**

**Стапасць — 1) зрелость; 2) солидность.**

**Сталы — 1) взрослый; 2) солидный, основательный;**

**3) постоянный.**

**Стаміцца — устать.**

Стаміліся рукі, абліўся ён потам,
А ўсё ж не пакінуў цяжкое работы.
*Уладзімір Дубоўка*



**Становішча — положение.**

**Старажытны — древний.**
**Старанны — прилежный, старательный.**

Гляньце, каля нашай хаткі Апусціў галоўкі боб

Дапамогі просяць градкі:
Вянуць моркаўка і кроп,

Градкі мы пальём не горш, Чым
старанны спорны дождж.

*Ніна Галіноўская*

**Старонка[1] — страница.**

**Старонка[2] — страна.**

Люблю наш край — старойку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

*Канстанцыя Буйло*





www.kamunikat.org

# С

**Старэйшы — старший.**

Мне купіў старэйшы брат
Новы фотаапарат.
Падрасту — здымаць пачну
Лета, восень і вясну...
І з альбома поры года
Будуць нас вітаць заўсёды.

*Кастусь Жук*



**Статак — стадо.**

**Стаў — пруд.**

= Вялікая сажалка.

**Стварыць — создать.**

**Стогн — тое, што енк.**

**Столь ж. — потолок м.**

Не мае гуку мяккі знак,
Ды чарадзейны ён, аднак,
І дзівіць зараз цэлы клас:
Над галавою *столь* у вас,
А мяккі знак адняць дазволь —
І стане *стол* заместа *столі.*

*Мікола Маляўка*

**Стома — усталость.**

**Стомлены — усталый.**

**Страва — блюдо; пища; кушанье.**

Дастае бабуля з печы
На вячэру для малечы
Чыгунок духмянай кашы.
Ён са страваю ўпрэлай
На стале адзін царуе.
Пах бульбяны бабкі спелай
Беларус заўжды пачуе.

*Леанід Пранчак*



# С

**Стракаты — пёстрый.**



**Страха — крыша.**
**Страціць — потерять.**

♦ За запытанне не страціш сняданне. (За спрос не бьют в нос.)

**Струменіцца — струйться.**

**Струмень — струя.**

— Я пакажу табе струмень
Вады гаючай і сцюдзёнай.
Каб не спаліў цябе прамень,
Яна паслужыць абаронай.

*Уладзімір Дубоўка*

**Стрымаць — сдержать.**

**Стрэльба — ружьё.**

**Стрэмка — заноза.**

**Студзень — январь.**
♦ Студзень — году пачатак, а зіме — сярэдзіна.
♦ Студзень пагодны — будзе год плодны.

**Стужка — лента.**

**Стэп** м. — **степь** ж.



**Сукенка — платье.**

У сукенцы каляровай, Ходзіць
У хусцінцы васільковай Па расквечаных лугах.

*Ніна Галіноўская*

**Сумаваць — скучать; тосковать; грустить.**

Дажджу чакае парасон, Чакае лыжка едака...
Чакае ўсіх у ложку сон. А я над рэчкаю сумую:
Чакае міска чарпака, Чакаю рыбку залатую.

*Іван Муравейка*

www.kamunikat.org

# С

**Сумесна — совместно, вместе.**

**Сумёт — сугроб.**



Мчыцца шпарка, мчыцца бойка
Па сумётах коней тройка.
Паганяе іх сама
Белакрылая зіма.
Здагадаўся я тады:
Тыя кон і — тры браты:
Снежань, студзень, люты.
Вось якія цуды!

*Уладзімір Мазго*

**Сумленны — честный, добросовестный, совестливый.**

Я — беларус маленькі,
Дарос ужо да школы,
Як і бацькі, сумленны,
Руплівы і вясёлы.

*Мікола Маляўка*

**Сум, сумота — печаль, тоска.**

= Пачуццё смутку, жалю, душэўнай горычы, трывогі; маркота, нуда, туга.

**Суніцы — земляника.**



Дзе ні глянеш, на паляне
Усё гарыць чырвоным ззяннем.
У бары, у бары
Дол увесь іскрыцца,
У бары, у бары
Выспелі суніцы.
*Хведар Гурыновіч*

**Супраць — против, напротив; вопреки.**



www.kamunikat.org

# С

**Супрацьлеглы — противоположный.**

**Сурвэтка — салфетка.**



**Сусвет — вселённая; мир.**

**Сусед — сосед.**
**Суседні — соседний.**
= Які знаходзіцца паблізу, побач, недалёка.

**Суседскі — соседский.**
= Які належыць суседу.

**Сустракаць — встречать.**

**Сустрэча — встреча.**

**Сухмень — сушь.**
**Суцешыць — утешить.**

Ніхто так не зразумее, не падтрымае, не суцёшыць, як мама.

**Суцішыць — успокоить, унять, замедлить.**

**Схаваць — спрятать.**



Мядзведзь узяў у пчол мядок.
Схаваў пад лаваю збанок.
На лаву сеў і — праваліўся.
Збанок на часткі разваліўся.
*Ніна Галіноўская*

**Схамянуцца — 1) спохватиться, опомниться;**
**2) встрепенуться.**

**Схапіць — схватить.**

**Схіл — склон, уклон; скат.**
**Схіліцца — склониться, наклониться.**



www.kamunikat.org

# С

**Схільны** *(да чаго)* — **склонный** *(к чему).*

**Сход — собрание.**

**Сцежка — тропа.**

**Сцерагчы — охранять, караулить, беречь.**

**Сцерагчыся — стеречься, остерегаться, беречься, опасаться.**

Кот цяпер не пройдзе нішкам*,
Бо званочак скажа мышкам:
— Дзінь-дзінь-дзінь, тра-та-та —
Сцеражыцеся ката!

*Уладзімір Дубоўка*



* Нішкам — тишком, украдкой.

**Сціплы — скромный.**

А быў у нас хлапец адзін —
Звычайны, сціплы селянін.

*Уладзімір Дубоўка*

**Сцісλы — сжатый.**

**Сцюдзёны — студёный, холодный.**



**Сцюжа — стужа, холод.**

**Сцяг — знамя, флаг.**

**Сцяжынка — тропка, тропинка.**

Заслалі поле, луг, сцяжынкі
Серабрыстыя сняжынкі.

*Міхась Пазнякоў*

**Сцяміць** — тое што **скёміць.**

**Сшытак — тэтрадь.**



www.kamunikat.org

# С

**Сырадой — парное молоко.**

**Сэнс — смысл.**
А вось як будзеце вучыцца,
То можна сэнсу і дабіцца.
*Якуб Колас*



**Сэрца — сердце.**

**Сябар, сябра — друг, приятель.**

**Сябраваць — дружить.**
З фізкультураю сябруем
І за партаю шчыруем,
І ў жыцці ўсё "о'кей",
Бо гуляем у хакей.
*Уладзімір Мазго*

**Сяброўка — подруга, подружка; приятельница.**

**Сябрук — тое, што дружбак.**
З горкі носам — і ў сумёт...
Хто не любіць з нас прыгод?
З горкі едзем "цягніком"
З Пецем, лепшым сябруком.
*Таццяна Мушынская*



**Сякера — топор.**

**Сям'я — семья.**

**Сярод — среди.**

**Сячы, секчы — рубіть.**
Лес сякуць, і ад стуку сякер
Далей уцякаюць птушка і звер.
*Анатоль Вярцінскі*

www.kamunikat.org

# Т

**Таксама — также, тоже.**

**Талентавіты — талантливый, одарённый.**
= Надзелены вялікімі прыроднымі здольнасцямі.

**Талерка — тарелка.**

Не пытайцеся ў Валеркі,
Дзе падзеліся талеркі:
З хаты ён, малы жанглёр,
Вынес друзачкі на двор.

*Мікола Маляўка*



**Танны — дешёвый.**

**Тата — папа.**

— Чаго баяцца? нічагутка!
— Закінем іх [кнігі] у снег ціхутка...
— Не, брат Алеська, не рабі ты,
Бо тата наш такі сярдзіты!

*Якуб Колас*

**Татаў — папин.**

**Таямніца — тайна, секрет.**

Трэба многа ўсім вучыцца,
Трэба многа ведаў мець, —
Можна свету таямніцы
Толькі з імі зразумець.

*Кандрат Крапіва*



www.kamunikat.org

# Т

**Таямнічы — таинственный.**

**Твань — тое, што дрыгва.**

**Твар — лицо.**

♦ У вочы — з мілым тварам, а за вочы — крутым варам.
(Мягко стелет, да жёстко спать.)

**Твор — произведение** (картина, скульптура, рассказ и т. д.).

**Тлумачальны — 1) пояснительный;**
**2) толковый** (о словаре).

**Тлумачыць — объяснять; толковать.**

Сёння няёмка Ігнатку,
Ён атрымаў не дзесятку:
Пяцёрку — за тое, што кепска чытаў,
Пяцёрку — за тое, што дрэнна пісаў...
Маме ж тлумачыць Ігнатка:
— Склаўшы іх — будзе дзесятка.

*Кастусь Жук*



**Тлусты — жирный.**

Вы не верыце? Не трэба.
Ды злавіў на шарык з хлеба
Дзядзька Лёша карася —
Тлустага, як парася.

*Уладзімір Скарынкін*

**Тлушч — жыр.**

**Толькі — только.**





www.kamunikat.org

# Т

**Трапіцца** — **1) попасться, встретиться; 2) случиться.**

**Трапляць** — **попадать.**

Як толькі Іван трапляе ў бяду,
У рукі бярэ чараўніцу дуду.
Прыскача на голас дуды бегунок —
Бясстрашны і верны... *(Канёк-Гарбунок).*

*Ніна Галіноўская*

**Трапна** — **метко.**

Лепшы форвард з развароту
Трап на ўдарыў па варотах —
І трапеча мяч у сетцы,
Як загнаны звер у клетцы.

*Уладзімір Мазго*



**Трапны** — **меткий.**

**Трашчаць** — **трещать.**

**Труціць** — **травить.**

**Трушком** — **трусцой, мелкой рысью.**

**Трымцёць** — **1) трепетать; дрожать; 2) мерцать; мелькать.**

Свіння стаяла пад балконам
З вялікім чорным парасонам.
Сціх дождж. Свіння бяжыць туршком
І — боўць* у лужыну бачком.

*Ніна Галіноўская*

* Боўць — бултых.

**Трывалы** — **прочный.**

**Трываць** — **терпеть.**





www.kamunikat.org

# Т

**Трымаць** — **держать.**

**Трэба** — **надо, нужно; необходимо; следует; требуется.**

**Трэска** — **щепка.**

**Туга** — **печаль; тоска; уныние.**

**Тужыць** — **тосковать; горевать; тужить; печалиться.**

**Турбавацца** — **беспокоиться, тревожиться.**

Хоць і страшная гадзюка —
Дужа не турбуйся:
Мі гам спляжыць тэту злюку
Доўгай дзюбай бусел.

*Васіль Зуёнак*

**Турбота** — **забота.**

**Тыдзень** — **неделя.**

♦ Едзеш на дзень, бяры хлеба на тыдзень.

**Тэлефанаваць** — **звонить по телефону.**

**Тэрмін** — **срок.**

**Тэрміновы** — **срочный.**





www.kamunikat.org

# У



**Убок — в сторону.**

На сцяжынцы клубок —
Не адкоціш убок,
А паколеш толькі
Рукі аб іголкі. *(Вожык)*

*Міхась Пазнякоў*

**Увага — внимание.**

Адны яе балотным танкам называюць,
Другія — рыцарам, апранутым у латы.
Я ж так скажу: яна нікога не чапае,
Нікому і нічым не пагражае —
Яна ўвагі нашай да сябе чакае. *(Балотная чарапаха)*

*Іван Муравейка*



**Уважлівы — внимательный.**

**Уверсе — вверху.**

У пакоі ўверсе я,
Люстрамі расквечана. *(Столь)*

*Міхась Пазнякоў*

**Увечары — вечером.**

**Увіхацца — хлопотать; увиваться.**

**Увішна — проворно, ловко.**

**Увогуле — вообще.**

www.kamunikat.org



**Увосень — осенью, по осени.**

Год у першы клас хадзіў,
А цяпер, увосень,
У другі ты пойдзеш клас —
Будзе сем гадкоў якраз.

*Васіль Зуёнак*

**Угары** — тое, што **ўверсе.**

**Удзел — участие.**

**Удзельнічаць — участвовать.**

**Удзень — днём.**

**Удзячнасць — благодарность.**

**Удзячны — благодарный.**

Дзеці! Змайструем кармушкі хутчэй,
Зерне насыплем — хай птушкі дзяўбуць,
Песню ўдзячную нам прапяюць.

*Алесь Ставер*

**Ужываць — употреблять.**

**Узбоч — 1) сбоку, рядом; 2) в стороне от.**

**Узбярэжжа — побережье, прибережье.**

**Уздоўж — вдоль.**

**Узлесак — опушка.**

**Узмежак — обмежек.**

**Узнагарода — награда.**

**Узнагародзіць — наградить.**

**Узнёслы — возвышенный.**





www.kamunikat.org

# У

**Узор** — **1) узор, рисунок; 2) образец.**

**Узрадавацца** — **обрадоваться.**

**Узрост** — **возраст.**

**Узрушыць** — **взволновать.**

**Укеміць** — **уразуметь, понять.**

**Улагодзіць** — **умиротворить.**

**Уласны** — **собственный.**

**Уласцівасць** — **свойство, особенность.**

**Улетку** — **лётом.**

**Улічваць** — **учитывать.**

**Улучыць** — **выбрать.**

= Знайсці, выбраць зручны час для нечага.

**Умацаваць** — **укрепить.**

**Уміг** — **мігом, мгновенно.**

Выйшаў з хаты пастушок
І зайграў ён у ражок.
І кароўкі ўміг яму
Адказалі: — Му-му-му!

*Янка Журба*



**Умова** — **условие.**

**Умовіцца** — **условиться.**

**Умоўны** — **условный.**

**Уначы** — **ночью.**

www.kamunikat.org

# У

**Упарты — 1) упорный, настойчивый; 2) упрямый.**

Навучыўся папугай
Вымаўляць: "Здароў!", "Бывай!"
Толькі ўпарты папугай
На "Здароў!" крычыць: "Бывай!",
На "Бывай!" крычыць: "Здароў!",
Вечна дражнячы сяброў.

*Кастусь Жук*



**Упершыню — впервые.**

**Употай — тайком, украдкой.**

**Упраўна — расторопно, ловко.**

**Упрыгожанне — украшение.**

**Упрыгожваць — украшать.**

**Упэўненасць — уверенность.**

**Ураджай — урожай.**

**Урадзіць — уродить.**

**Уражанне — впечатление.**

**Ураз — тут же, сразу, враз; моментально.**

**Уразіць — впечатлить, взволновать.**

**Урачыстасць — торжество.**

**Урывак — отрывок.**

**Ускраіна — окраина.**



**Услон — скамейка** (комнатная переносная).

www.kamunikat.org

# У

**Услончык, услонік — скамеечка** (комнатная переносная).

Услончык у вітальні —
Маленькі, зручны, мяккі Да
сценкі прытуліўся Ля
дыванка сабакі.

Нібы маленькі слонік,
Мне падстаўляе спіну,
Каб я прысеў з дарогі І
чаравікі скінуў.

*Леанід Пранчак*

**Усмак — всласть.**



**Усмешка — улыбка.**

**Усміхацца — улыбаться.**

**Успамін — воспоминание.**

**Успамінаць — вспоминать.**

**Усхапіцца — вскочить.**

**Усход — восток.**

**Усчаць — начать, затеять, п<** **поднять.**

**Утульнасць — уют.**

**Утульны — уютный.**

**Ухапіць — ухватить.**

**Уцякаць — убегать.**



Яго ўсе просяць і чакаюць,
А прыйдзе ён — дык уцякаюць. *(Дождж)*

*Міхась Пазнякоў*



**Уцяміць — сообразить, понять.**

Яшчэ раз уцям і ўкем:
Калі ем, я глух і нем.

*Васіль Вітка*



www.kamunikat.org

**Уцячы — убежать.**

Ён уцёк ад рыбака,
Ён уцёк ад шчупака
І жыве за іх не горш
У рацэ калючы ёрш.

*Уладзімір Мазго*



**Учора — вчера.**

**Учынак — поступок.**

Пра ўсе свае ўчынкі,
Пра добрае ці злое
Павінны без затрымкі
Сказаць часінай тою.
За дрэнны ўчынак ганяць,
За добры ўзносяць славу, —
Было на той паляне
Прыгожа і цікава.

*Уладзімір Дубоўка*



**Ушчуваць — бранить, упрекать.**

**Ушчэнт — полностью; вдребезги;**

**Уявіць — представить, вообразить.**

Без цымбалаў немагчыма
Уявіць маю Айчыну,
Бо і ў радасці і ў скрусе
Любяць іх на Беларусі.

*Алесь Пісьмянкоў*



www.kamunikat.org

# Ф



**Фарба — краска.**

**Фарбаваць — красить.**

Фарбавалі мы акно
Фарбаю алейнаю,
І цяпер зіхціць яно
Белізной завейнаю.
*Леанід Пранчак*

**Фіранка — занавеска.**



**Форвард — нападающий.**

**Фортка — форточка.**

**Фўтра** *н.* — **1) мех; 2) шуба.**

**Футэрка** *н.* — **шубейка ж.**

**Фэст — праздник.**
= Свята з кірмашамі і гулянием.





www.kamunikat.org

# Х

**Хавацца — прятаться.**

Ходзіць над дахам, над лесам і лугам.
Ходзіць адна і з сяброўкамі — цугам.
Сонца хавае,
Слязу праліве. *(Хмара)*

*Уладзімір Мацвеенка*



**Хай, няхай — пускай, пусть.**

Нам хараша ў нашай краіне.
Жыві, Беларусь, прыгажэй!
Пад небам праменістым, сінім
Хай Божа цябе беражэ!

*Ніна Галіноўская*

**Хай лук— беличье гнездо.**

**Халадэча — холодина.**

= Моцны холад.

**Хапаць — хватать.**

**Хараство — красота.**

**Харч — пища.**

**Харчавацца — питаться.**







www.kamunikat.org

**Хата — изба, дом.**

= Жылая сялянска пабудова з бярвення.

— Небарака чарапаха, Што стаілася пад дахам? Нейкі домік твой нягеглы, Не з камення і не з цэглы.

Кі дай гэтую хаціну! — Родны домік я не кіну! Хай са мной вандруе хатка, Як турысцкая палатка!

*Павел Марціновіч*

**Хваліцца — хвастать.**

♦ Хваліцца — не касіць, рука не забаліць. (Хвастать — не колёса мазать.)

**Хваля — волна.**

Сіняй стужкаю ў прасторах
Разгарнулася да мора

І мяне, як сяброўка,
Лашчыць хваляю рака.

*Уладзімір Мазго*

**Хваляваццa — волноваться.**



**Хвароба — болезнь.**

**Хвіліна — минута.**

Водзяць з году ў год хвіліны
Незвычайны карагод.
Падлічыў іх — акурат
Шэсць дзесяткаў — шэсцьдзесят.

*Кастусь Цвірка*

**Хвойнік — сосняк.**

= Хваёвы лес.



**Хвоя — сосна.**

**Хіліцца — клониться.**

**Хітрун — хитрец.**



www.kamunikat.org

# Х



**Хлопчык — мальчик**

Не сядзіцца ў хаце Кліча яго рэчка,
Хлопчыку малому, Цягнуць санкі з дому.

*Якуб Колас*

**Хлусіць — врать, лгать.**

о

**Хлусня — ложь, враньё.**

Не, я не жартую. Не, я не смяюся.
Так, я ў акулярах і ў ложак кладуся.
Чаму? Ды таму, вам скажу без хлусні:
Каб бачыць выразней цікавыя сны.

*Іван Муравейка*

**Хмара — туча.**

= Вялікае, звычайна цёмнае воблака, якое прыносіць дождж, град, снег.

Тут хмара гутарку ўсчала:
— А што з твайго таго святла?
Закрыю неба пеляной,
Зямлю ўсю залію вадой.
Над светам ноч устане ўдзень,
Святла не стане анідзе*.

*Уладзімір Дубоўка*

* Анідзё — нигде.



**Хмарны, хмурны — облачный, пасмурный**

**Хмарыцца — заволакиваться тучами.**

**Хмурынка — тучка.**

А на небе — ні хмурынкі!
Сонца ззяе, як дзяўчынка.
Воблакі плывуць — як з мараў,
Вам вясёлка — замест хмараў!

*Таццяна Мушынская*

www.kamunikat.org

# Х

**Хмызняк — кустарник.**

= Кусты, зараснікі маладых дрэўцаў.

**Хованкі — прятки.**

**Ходзікі — ходики.**

= Насценны гадзіннік з гірамі.



**Хросны — крёстный.**

**Хрушч — майский жук.**

Зеляніну я люблю.
Лісце ем, на лісці сплю.
Мой любімы месяц май.
Хто такі я, ад гадай. *(Хрушч)*

*Ніна Галіноўская*

**Хрысціны, хрэсьбіны — крестины.**

= Хрысціянскі абрад хрычшэння.

**Хустка — платок.**

**Хусцінка — платочек.**

**Хуткасць — скорость; быстрота.**

**Хуткі — быстрый.**

**Хутчэй — быстрее, скорее.**

Дожджык, дожджык, л і
З воблачка-крынічкі,
Каб хутчэй раслі
Яблынькі-сястрычкі.

*Мікола Маляйка*



www.kamunikat.org

# Ц



**Цагліна — кирпичина.**

**Цапкам — целиком.**

**Цараваць — царствовать.**

**Цацка — игрушка.**

У Дзяніскі сёння свята:
Цацак дзед прынёс багата —
Верталёт і самаходку,
І пластмасавую лодку,
Матаролер і машыну
З размалёванай кабінай.

*Алесь Ставер*

**Цвік — гвоздь.**

Я шпакоўню майструю,
Дошкі спрытна пілую.
Малаток, зух такі,
Заганяе цвікі!
Цвік наскочыў на сучок,
Выгінае цвік бачок.

*Мікола Мятліцкі*

**Цемра — мрак, тьма.**

**Цеплыня — тепло, теплота.**

Быў час, калі агню нідзе
На свеце не было ў людзей.
І цеплыня ім, і святло —
Усё ад сонейка ішло.

*Уладзімір Дубоўка*





www.kamunikat.org

# Ц



**Цецярук — тетерев.**

**Цікавасць — интерес.**

**Цікаваць — следить, высматривать.**

**Цікавіцца — интересоваться.**

**Цікавы — интересный.**

Я сягоння вам хачу
Расказаць пра сад дзіцячы,
Што там добрага пачуў,
Што цікавага пабачыў.

*Алесь Александрович*

**Цікаўнасць — любознательность, любопытство.**

**Цікаўны — любознательный; любопытный.**

**Ціснуць — жать, давить.**

**Цішыня — тишина.**

**Ціхмяны — тихий.**
= Паслухмяны, пакорлівы, лагодны, рахманы.

**Цкаваць — травить, науськивать.**
= Напускаць сабак на некага.

**Цмок — змей.**

= Казачная пачвара ў вобразе змея, дракона.

**Цугам — один за другим, гужом.**
**Цуд** — тое, што **дзіва.**

Адкрывае школа цуды
Мне і ўсім маім сябрам.
Калі-небудзь, можа, буду
Я настаўнікам і сам.

*Эдзі Агняцвет*



# Ц



**Цудоўны — чудесный.**

**Цукар — сахар.**

**Цукарніца — сахарница.**

**Цукерка — конфета.**

Лядзянкі-цукеркі,
Залазьце ў паперкі.
Сядзіце, маўчыце,
Як зайцы ў жыце.

Цукеркі-лядзянкі
Любімыя ў Янкі.
Так сталася — хлопча
Заўсёды іх смокча.

*Леанід Пранчак*

**Цыбаты — 1) длинноногий; 2) долговязый.**

Аляксей — хлапчук цыбаты.
У вялізных ботах таты
Ён стаіць кал я стаўка,
Воч не зводзіць з паплаўка.
*Уладзімір Скарынкін*

**Цыбуля — лук.**



От бабуля важна села
І глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш — бузеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
Называецца цыбуля.

*Рыгор Барадулін*

**Цымбалы — цимбалы.**
= Народны музычны струнны інструмент, на якім іграюць, ударакочы драўлянымі малаточкамі па струнах.

**Цыраваць — штопать.**

**Цырульнік — парикмахер.**

www.kamunikat.org

# Ц

**Цырульня — парикмахерская.**



Цырульня адкрываецца,
Хутчэй, хутчэй бяжы!
Зуброў, мядзведзяў, зайцаў —
Усіх стрыгуць стрыжы.

*Васіль Зуёнак*

**Цьмяны — 1) тусклый; 2) туманный, смутный.**

**Цэгла — кірпич.**

Жырафа следам бегла І
падавала цэглу. Упраўна
брала з долу Яна любыя
Bbici...

Пабудавалі школу —
Спыніся і дзівіся, Якія гмахі
ўзніклі. Вось гэта дык
канікулы!

*Васіль Вітка*

**Цягнік — поезд.**

Уздыхнуў і закрычаў, І
ўдалеч паімчаў,

І з вачэй у цемры знік
Назаўжды цяпер цягнік.

*Уладзімір Мазго*

**Цяжар — тяжесть.**

**Цяжкасць — 1) тяжесть; 2) трудность.**

**Цяміць — соображать.**



**Цярплівы — терпеливый.**

**Цясляр — плотник.**

Без сякеры, без нажоўкі
Мы будуем хату лоўка.
Нам не трэба жвір і мох.
У свеце лепшых цесляроў
Не бывае за баброў.

*Мікола Бусько*



www.kamunikat.org

# Ч



**Чабор — чебрец.**

Над лясною палянаю
Пах плыве да аблокаў —
Пахнуць зорачкі цьмяныя
Чабарку баравога.

*Хведар Гурыновіч*

**Чакаць — ждать, ожидать.**



Над лугамі, над палямі
Плачуць доўгімі слязамі.
Бульба, травы і жыты
Часта слёз чакаюць тых. *(Хмара і дождж)*

*Міхась Пазнякоў*

**Чапаць — трогать.**

♦ Не чапай чужога і не бойся нікога.

**Чапля — цапля.**



Дзе густая асака,
Дзе ў затоцы спіць рака,
Чапля шэрая чакае,
Хто вячэраць пагукае.

*Мікола Мятліцкі*

**Чапяла — сковородник.**

**Чаравік — ботинок.**

Скураныя чаравікі — збітыя насы.
Наступілі непрыкметна сумныя часы.
Я насіць вас не жадаю, бо старыя вы.
У адным — падэшва з дзіркай, а другі — крывы.

*Леанід Пранчак*

www.kamunikat.org

# Ч

**Чарада — 1) стадо, стая; 2) вереница, череда.**

Як дзяды, яны з барадамі,
Ходзяць цэлымі чародамі.
Проста дзіва — не звяры,
Называюцца — зубры.

*Алесь Якімовіч*

**Чарадзей — волшебник.**



Дабрадзеі тры харобрых:
Ранак, Дзень і Вечар добры.
Хто вітае іх часцей,
Той жыве, як чарадзей.
Хто ж да ласкі найахвочы,
Яшчэ й зычыць: — Добрай ночы!

*Сяргей Панізнік*

**Чараўнік — тое, што чарадзей.**

Мілы, добры чараўнік,
Ты куды надоўга знік?
Шмат табе я расказаў бы,
Дарагі стары Хатабыч.

*Ніна Галіноўская*



**Чараўніца — волшебница.**

**Чарга — очередь.**

— Ха! — сказаў з усмешкай я.
А цяпер чарга мая.
Вось як трэба разганяцца,
Каб у лужы не скупацца!
Толькі лужа — ну і ну —
Хап за левую нагу!
Пацягнула за штаны —
Сталі мокрымі яны.
Будзе зараз нам ад мамы.
Брат маркотны. Я таксама.

*Алесь Бадак*





www.kamunikat.org

**Чарніцы — черника.**



Бярозы бегаюць вакол,
Пярэстыя, як догі.
Чарніца — у рот, чарніца — у кош,
Збіраць мне доўга-доўга.
*Хведар Гурыновіч*

**Чарпак — черпак.**

**Чароўны — волшебный**

Не на краёчку свету,
А ў нас, сярод асін,
Знайшла вавёрка летам
Чароўны... апельсін.
*Мікола Маляўка*

**Чарот — камыш.**

**Чары — колдовство.**

Тры разы яна кульнецца —
Чары скінуцца варожыя.
І становіцца квакуха
Зноў дзяўчынаю прыгожаю. *(Царэўна-жаба)*
*Ніна Галіноўская*



**Час — время.**

Час няспынна і імкліва
Пралятае — проста дзіва!
Запыніць імгненне рад
Татаў фотаапарат.
*Уладзімір Мазго*

**Часам — иногда.**

**Часнок — чеснок.**



У цыбулі — родны брат,
Ласкавейшы быццам, А да
слёз давесці рад
Так, як і сястрыца.
Сам сабе наўме* панок, 0
и А працей сказаць — часнок.
*Рыгор Барадулін*



* Сабё наўмё — себе на уме. //



www.kamunikat.org

# Ч

**Часовы — временный.**

**Часопіс — журнал.**

Ты атрымаў часопіс новы. Усе прачытваеш старойкі. Цябе вітаць заўжды гатовы Яго герой... *(Вася Вясёлкін).*

*Ніна Галіноўская*

**Частаваць — угощать.**

Прыбірае грады, Бульбу ў склеп згружае, Нас частуе хлебам З новага ўраджаю. *(Восень) Мікола Маляўка*

**Чацвер — четверг.**

**Чвэрць — четверть.**

**Човен — чёлн, челнок.**



Човен борзда ўдаль імкнецца,
Зіхаціць пры ім вясельца*.

*Уладзімір Дубоўка*

* Вясёльца — вёслышко.

**Чуйны, чулы — чуткий, отзывчивый, душевный.**

Добрым будзь! І чулым будзь!
Ведай, што жыццё ўдзячнае такім.
Прымацуеш у двары шпакоўню —
Раніцай пачуеш з яе гімн.

*Генадзь Пашкоў*



**Чутны — слышный; слышимый.**

**Чуць — слышать.**

Хвароба такая ў птаха ляснога:
Кал і засплявае — не чуе нічога. *(Глушэц)*

*Мікола Маляўка*

**Чыгун — чугун.**

**Чыгўнка — железная дорога.**



На чыгунцы гаспадарыць,
Мчыць без дыму і без пары.
А яшчэ зазначу —
Нас вязе на дачу. *(Электрычка)*
*Міхась Пазнякоў*

**Чыніць — делать, чинить.**

= Рабіць, тварыць.

♦ Чаго не хочаш самому, не чыні другому. (Чего сам не любишь, того и другим не желай.)

**Чырвань — краснота.**

**Чырвоны — красный.**

Баіцца ён, чырвоны,
На дол упасці з кроны,
Каб не паклаў у кошык Яго
ласунчык-вожык. *(Яблык) Мікола Маляўка*

**Чысціня — чистота.**



**Чытальня — читальный зал.**

**Чытач — читатель.**

**Чэрава — чрево.**
= Унутраная частка жывата чалавека, жывёлы

**Чэрвень — июнь.**

- ♦ У чэрвені ўбачыць спадар*, што Бог дасць у дар
- ♦ Чэрвень не гуляе — ураджай люляе.

♦ Спадар — *тут:* хозяин.

**Чэрвеньскі — июньский.**



www.kamunikat.org

# Ш



**Шавец — сапожник.**
= Майстар, які шые і рамантуе абутак.

**Шалік — шарф.**

Шалік бабулін зроблены з воўны,
Цёплы і модны, нават шыкоўны.
Вецер пранізлівы, вые завея...
Шалік бялюткі шыю мне грэе.

*Іеанід Пранчак*

**Шанаваць — 1) чтить, почитать; уважать; 2) беречь.**

**Шаноўны — уважаемый.**

**Шанцаваць — везти.**

= Прыносіць удачу.

**Шаўковы — шёлковый.**



**Шафа — шкаф.**

**Шаша** ж. — **шоссе** ср.

**Швачка — швея.**

**Шкада — жалко.**
**Шкадаваць — жалеть.**
Бабулю шкадаваў унучак Лёнік:
— Стамілася? Ідзі, прысядзь на ўслонік.
Я ж вымыю гаршчок і апалонік.

*Данута Бічэль-Загнетава*



www.kamunikat.org

# Ш

**Шкарпэткі — носкі.**

**Шкло — стекло.**



**Шклянка — стакан.**

**Шкляны — стеклянный.**

**Шкода — вред; ущерб.**

= Страта; урон; дрэнны, небяспечны ўчынак

Я такую маю моду
Спадцішка прыносіць шкоду.
Многім я далася ў знак.
Я бабуля Шапакляк.

*Ніна Галіноўская*



**Шкодзіць — вредить.**

= Прыносіць шкоду, наносіць урон, страту.

Курыць — здароўю шкодзіць!

**Шкоднік — вредитель.**

**Шлях — 1) путь; 2) большак; 3) тракт.**

**Шмат — много.**

— Адкажы, чаму ты, дрозд,
Гэтак здарова падрос?

— Шмат увосень еў рабіны, Ну
а гэта ж вітаміны!

*Васіль Вітка*



**Шпак — скворец.**

**Шпакоўня — скворечник.**

Хорам нам пяюць шпакі:
"Новая шпакоўня
Зроблена дыхтоўна!"
"Дзесяць" ставяць нам шпакі.
А яны ж не лайдакі!

*Таццяна Мушынская*



www.kamunikat.org

**Шпалеры — обои.**

Як пакляілі шпалеры,
Дык нібы з бяроз
Лісця жоўтага ў кватэры
Чараўнік натрое.

*Мікола Маляўка*



**Шпарка — быстро.**

Едзе месячык на хмарках.
Эх, імчацца яны шпарка!
Хмаркі, хмаркі, асцярожна,
Так і месяц скінуць можна.

*Ніна Галіноўская*

**Шпаркасць — быстрота, скорость.**

**Шпурляць — швырять.**

**Штовечар — каждый вечер.**

**Штогод — ежегодно.**

**Штодзень, штодня — ежедневно.**

**Штодзенна — ежедневно.**

Будзь беларусам, беларус,
І помні, што казаў Ісус.
Хай беларуская ікона
Твой асвячае шлях штодзённа.

*Рыгор Барадулін*



**Штолета — каждое лето.**

**Штомесяц — ежемесячно.**

# Ш

**Штоноч, штоночы — каждую ночь.**

**Штораз — каждый раз.**

**Штораніцы — каждое утро.**

**Штотыдзень — еженедельно.**

**Штохвіліны — ежеминутно.**

**Штукар — 1) фокусник; 2) изобретатель.**



**Штуршок — толчок.**

**Шукаць — искать.**

Доўга дзед шукаў наўкола
Дужкі, вушкі, шкельцы-колы.
Што згубіў, усё знайшлося.
Дзе? На ўласным пераноссі!
*Пятро Сушко*

**Шурпаты — шероховатый.**

**Шуфляда — выдвижной ящик.**

**Шчака — щека.**

**Шчасце — счастье.**

**Шчаўе — щавель.**

**Шчодры — щедрый.**

Цёплае, жаданае,
Шчодрае, духмянае.
Ну, вядома, гэта
Радаснае... *(лета).*
*Міхась Пазнякоў*



www.kamunikat.org



**Шчупак** м. — **щука** ж.

Там, дзе вір — глыбокі гляк —
Затаіўся, спіць шчупак.
Хто сказаў, што спіць шчупак?
Сочыць плотак-разявак!

*Мікола Мятліцкі*

**Шчыльны — плотный.**

**Шчыра — йскренне.**

**Шчыраваць — усердствовать, очень стараться.**

Шчыруйце ўсе, як пчолы,
А пройдзем першы клас —
Фатограф каля школы
На памяць здыме вас.

*Мікола Маляўка*

**Шыба — оконное стекло.**

Шыбы вымыў першы лівень —
І заззяў ён, дом,
Быццам вокны ўсе зашклілі
Сонечным святлом.

*Мікола Маляўка*



**Шыкоўны — шикарный.**

**Шыпшына — шиповник.**

**Шыя — шея.**

**Шэрань — иней, изморозь.**

**Шэры — серый.**



www.kamunikat.org

# Ю



**Юнак — юноша.**

= Малады чалавек, хлопец

**Юнацтва — юность.**

= Перыяд жыцця ад дзяцінства да сталасці.

**Юннат — юннат, юный натуралист.**

= Удзельнік гуртка па вывучэнні прыроды.

У мяне старэйшы брат
Тры гады ўжо юннат;
Што пасеяў у агародзе,
У яго заўсёды ўродзіць.

**Юшка[1] — 1) уха** (суп из рыбы); **2) кровь.**



Тата хутка на кастры
Страву рыбную зварыў.
Кажа: — Еш, дачушка!
Смачна пахне юшка.
*Уладзімір Мазго*

**Юшка[2] — вьюшка.**

= Чыгунная заслонка ў коміне, якой закрываюць адтуліну, каб не выходзіла цяпло.

www.kamunika.org

# Я



**Яблык м. — яблоко ср.**

**Яблыня — яблоня.**

**Яда — еда, пища.**

**Яднаць — объединять.**
= Злучаць, звязваць нешта.



**Ядомы — съедобный.**

= Прыдатны для ежы.

**Ячня, яешня — яйчница.**

**Якасць — качество.**

**Якраз — как раз.**

**Яліна — ель.**



= Высокая елка.

**Яловы — еловый.**

**Яскравы — яркий.**
= Выразны, ясны, яркі.



www.kamunikat.org

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год



www.kamunikat.org